# АД ПРАДЗЕДАЎ СПАКОН ВЯКОЎ НАМ ЗАСТАЛАСЯ СЛУЖБА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён нават пераняў у дзеда адну традыцыю: свае ўзнагароды, пачынаючы з курсанцкіх пагонаў і да маршальскіх, Сяргей Леанідавіч захоўвае ў дыпламаце. Яны перацягнуты стужкай, пазначаны нумар загада. «Калекцыя вельмі прыгожая: ордэнаў каля 90, парадны кіцель... Я таксама збіраю пагоны», — распавядае маёр Сакалоў.

Зараз 96-гадовы Сяргей Леанідавіч на заслужаным адпачынку ў Маскве. Унук бачыцца з дзедам у час водпуску, а па тэлефоне цікавіцца аб яго здароўі, віншуе са святамі. Абавязкова звяжацца з дзедам 23 лютага. Ці любіць паслухаць успаміны маршала? Так, але Сяргей Леанідавіч не аматар узгадваць аб службе і шмат чаго трымае ў сакрэце. Праўда, некаторыя гісторыі, напрыклад, як ваяваў, расказвае па пяць-шэсць разоў.

Паводле слоў маёра Сакалова, яму дастаткова толькі зірнуць на маладога чалавека, каб сказаць, чаго ён дасягне ў вайсковай службе. Праўда, канкрэтна вызначыць, што дапамагае гэта зрабіць — вопыт службы ці гены — не можа (магчыма, абодва фактары?). Прарочыць ваенную кар'еру свайму маленькаму сыну пакуль не спяшаецца, затое прадзед не сумняваецца, што юнак працягне вайсковую дынастыю: нараджэнне Дзімы ў Дзень танкіста для яго — добры знак.

## Калі пагоны ў радасць

У сям'і Ананіч таксама ёсць ваенныя карані. Прадзед сувораўца Дзяніса не быў маршалам, але для праўнука — сапраўдны прыклад мужчыны: Афанасій Мартынавіч з'яўляўся сапёрам-падрыўнікам, служыў у Чырвонай Арміі, у 1941-м добраахвотна пайшоў на фронт, хоць падстава застацца дома была — восем дзяцей (пасля вайны нарадзілася яшчэ чатыры), дайшоў да Берліна і вярнуўся дадому толькі ў 1946-м, бо пасля вялікай Перамогі на адваротным шляху размініраваў палі, каб не было падрываў. Дарэчы, за свае заслугі ў гады вайны ён атрымаў ордэн Айчыннай вайны, у пасляваенны час быў узнагароджаны... каровай, што на той момант было вельмі даспадобы. Самай значнай заслугай прадзеда Дзяніс лічыць яго ўдзел у Вісла-Одэрскай аперацыі. Дзед хлопца, Анатоль Афанасьевіч, шмат нацярпеўся ў дзяцінстве, бо ў пяцігадовым узросце разам з сям'ёй стаў вязнем. Служыў у Савецкай арміі, у танкавых часцях на савецка-фінскай мяжы, пасля арміі каля 20 гадоў баразніў акіяны. Цікава, што Дзяніс нарадзіўся ў той жа дзень, калі дзеду споўнілася пяцьдзесят гадоў — 23 сакавіка. Бацька юнака, падпалкоўнік Ананіч, лічыць гэта сімвалічным знакам, ды і лічба 23 у ваенных сем'ях выклікае адну асацыяцыю — Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл. На маё пытанне, ці засмуціцца Юрый Анатольевіч (начальнік групы аддзела ваеннай адукацыі ўпраўлення ваеннай адукацыі і падрыхтоўкі войск Узброеных Сіл. — **Аўт.**), калі яго сын пасля завяршэння суворавскага вучылішча ўсё ж выбера не ваенную прафесію, а іншую, пачула такі адказ: «Раней пасля суворавскага вучылішча паступленне ў ваенныя ўстановы было абавязковым, існаваў план размеркавання, а зараз можна рабіць выбар. Я ні ў якім разе не стану прымушаць Дзяніса. Няхай сам расстаўляе прыярытэты ў сваім жыцці: ён шэсць гадоў носіць суворавскія пагоны і ведае, што значыць суровая мужчынская рэчаіснасць, а гэта не тое, што хадзіць у школу і гуляць пасля ўрокаў. Выпуск майго сына з суворавскага вучылішча для мяне стане галоўнай падзеяй гэтага года, але спадзяюся, што самае яркае ў нас яшчэ наперадзе — у кар'еры сына і ў маёй таксама». Сам жа Дзяніс, калі нічога не перашкодзіць, плануе працягнуць ваенную дынастыю сваёй сям'і: вырашыў паступаць на ваенна-тэхнічны факультэт БНТУ, а наогул марыць стаць сапёрам, як прадзед.

## Свята мужчын і... жанчын

І ўсё ж пытанне, каго віншаваць 23 лютага, засталося. А што на гэты конт лічаць ветэраны? Анатоль Мікалаевіч Новікаў, старшыня Рэспубліканскага савета ветэранаў вайны і працы, лічыць, што ўсе прадстаўнікі моцнага полу, нават юнакі ў дзіцячых садках, — патэнцыяльныя абаронцы сваёй краіны: «Нават калі чалавек ужо не служыць, ён працуе ў нейкай сферы і гэтым уносіць свой уклад у эканамічную бяспеку, бяспеку грамадства і г. д. Сёння трэба віншаваць не толькі мужчын, але і... жанчын. Яны таксама служаць, паступаюць у Ваенную акадэмію, у некаторых краінах нават з'яўляюцца міністрамі абароны. А яшчэ жанчын трэба абавязкова віншаваць, бо яны — наш надзейны тыл, без якога нельга абысціся. Напрыклад, я ажаніўся праз тыдзень, як атрымаў лейтэнанцкія пагоны і без дапамогі маёй жонкі наўрад ці стаў бы генералам, таму частку сваіх заслуг я дзялю з ёй».

Яўген Васільевіч Мікульчык, старшыня Беларускага саюза афіцэраў, генерал-лейтэнант у адстаўцы, выказаў спадзяванне, што і ў новым пакаленні вайскоўцаў будуць такія ж патрыёты, як і ў час яго службы: «Служыць у беларускай ваеннай акрузе было ганаровай справай. Зараз прэстыж людзей у пагонах паступова расце. Некаторыя маці просяць узяць сваіх сыноў у армію, каб зрабіць з іх чалавека, але служыць бяруць не кожнага. Сённяшняя беларуская армія не настолькі вялікая — 65 тысяч чалавек, але яна мабільная і арганізаваная, забяспечвае бяспеку паветраных і наземных межаў... У гэта свята я хачу пажадаць усім людзям у пагонах праяўляць найвышэйшыя адказнасць і культуру ў час выканання свайго абавязку і ўмець кіраваць малымі і вялікімі калектывамі ў экстрэмальных сітуацыях, быць добрымі камандзірамі, а гэта — сапраўднае майстэрства».

***P.S. «Звязда» таксама віншуе ўсіх людзей у пагонах (і мужчын, і жанчын), нашых ветэранаў са святам і няхай у кожнай сям'і будзе сапраўдны абаронца.***

**Ірына ПРЫМАК.**

# УЗРОВЕНЬ ЗАРОБКАЎ «ПРАСОЧАЦЬ» ПА БАЗЕ

**Ужо ў бліжэйшы час на Міншчыне будзе створана электронная база даных заробкаў па ўсіх без выключэння прадпрыемствах. Пры гэтым, мяркуюць у абласным камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, з'яўленне падобнай базы дазволіць аператыўна кантраляваць узровень аплаты працы непасрэдна на месцах, а пры неабходнасці — уплываць на памеры зарплаты.**

## НАЙПЕРШ ЗВАЖАЙ НА... АЎТСАЙДАРА

293 долары ў сярэднім па вобласці, і ў тым ліку 260 долараў — па бюджэтнай сферы. Такімі былі плата на снежань мінулага, 2006 года. Паводле слоў намесніка старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароны Мінаблвыканкама Алены Кузьміной, гэта задача сталася па-сапраўднаму няпростай, і для яе вырашэння давялося выкарыстоўваць розныя шляхі. Да прыкладу, адзін з іх — тлумачэнне кіраўнікам арганізацый рознай формы ўласнасці варыянтаў эканамічнага стымулявання работнікаў, магчымасцяў вызначэння даплат за шкодныя ўмовы працы, за сумяшчэнне прафесій, павышэння акладаў пры пераводзе на кантракты.

Адначасова быў наладжаны строгі кантроль за налічэннем заробкаў у памеры не менш за «мінімалку», якая, як вядома, на працягу мінулага года складала 156 900 рублёў. Найбольш пытанняў тут традыцыйна ўзнікае па недзяржаўных арганізацыях. Таму, паведаміла Алена Кузьміна, летась тут прайшлі 2355 спецыяльных праверак.

І ўсё ж самай складанай аказалася сітуацыя на асобных камунальных прадпрыемствах. Як паказаў аналіз, у пачатку мінулага года з крыху больш чым двух тысяч «мясцовых» суб'ектаў гаспадарання 41 меў узровень сярэдняй зарплаты ніжэй 200 долараў у эквіваленце. Прычым перш-наперш гэта датычылася прадпрыемстваў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, камбінатаў бытавога абслугоўвання і швейных фабрык.

Зразумела, што прычыны невысокіх заробкаў заўсёды трэба «шукаць» у эканоміцы. З улікам гэтага, адзначыла Алена Кузьміна, на працягу мінулага года пад асаблівым кантролем на «праблемных» прадпрыемствах знаходзіліся павелічэнне аб'ёмаў прадукцыі і паслуг, змяншэнне выдаткаў вытворчасці, крэдыторскай і дэбіторскай запазычанасці, эканомія матэрыяльных і працоўных рэсурсаў. У рэшце рэшт, «асаблівая ўвага» дала плён — за студзень—лістапад мінулага года доля стратных арганізацый у вобласці зменшылася на 4,1 працэнтнага пункта. А колькасць прадпрыемстваў з сярэдняй зарплатай ніжэй 200 долараў скарацілася з 41 да 16. І, у прыватнасці, сумны спіс пакінулі арганізацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі і перапрацоўкі малака.

У сваю чаргу гэта акалічнасць паўплывала на паказчыкі ў цэлым. Як зазначыла Алена Кузьміна, летась Міншчына перавысіла першапачатковыя планы па павышэнню заробкаў. Іх сярэдні паказчык у снежні склаў 296, і ў тым ліку па бюджэтнай сферы — 272 долары ў эквіваленце. Пры гэтым адметна, што заробкі па вобласці апярэдзілі рост цэн на 15,9 працэнта.

Дарэчы, цікава, што на найбольш высокі ўзровень зарплаты ў снежні выйшла Салігоршчына — 437 долараў ЗША. Апроч таго, у лідарах апынуліся Мінскі (344), Дзяржынскі (327), Маладзечанскі (291), Нясвіжскі (275) раёны, а таксама горад Жодзіна (320 долараў у эквіваленце).

## 30 ДОЛАРАЎ ПРЫБАЎКІ

Рост цэн на імпартныя паліўна-энергетычныя рэсурсы, безумоўна, — самы непрыемны «сюрпрыз» пачатку новага года. Тым не менш, мяркуюць у камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама, гэта акалічнасць не павінна прывесці да спынення росту зарплаты. Так, вызначана, што па выніках ужо сёлетняга снежня яе сярэдні паказчык па рэгіёну выйдзе на адзнаку 708,5 тыс., і пры гэтым па бюджэтнай сферы — на 621,3 тыс. рублёў. Ці, адпаведна, на 325 і 285 долараў у эквіваленце.

Вядома, што асноўнай крыніцай росту ў бюджэтнай сферы застанецца змяненне тарыфнай стаўкі І разраду. Аднак не толькі. Паралельна, зазначыла Алена Кузьміна, нельга скідваць з рахункаў пазабюджэтную дзейнасць. Сёлета менавіта яна павінна прынесці 27 тысяч «сярэднямесячнай» прыбаўкі. А ў снежні кожны бюджэтнік мусіць зарабіць «на сябе» ўжо 36 тысяч рублёў.

Што да рэальнага сектара эканомікі, то тут усё будзе зноў-такі залежаць ад вынікаў гаспадарчай дзейнасці канкрэтных арганізацый. Разам з тым у адносінах да кожнай з гэтых арганізацый вызначаны свае планы павышэння заробкаў. Планы будуць кантралявацца. І ў тым ліку, запэўнівае Алена Кузьміна, кантралявацца не зусім традыцыйным спосабам.

## «ПАДКАЗКІ» ДАЕ МАНІТОРЫНГ

Задума электроннага маніторынгу сітуацыі з зарплатай з'явілася некалькі гадоў таму. Яго сутнасць аказалася простай. Спачатку рэгулярна збіраюцца поўныя звесткі аб аплаце працы на ўсіх прадпрыемствах кожнага раёна. А потым, дзякуючы мадэму, інфармацыя «зводзіцца» ў агульны банк даных вобласці.

— Пры гэтым з'яўляецца магчымасць штомесяц адсочваць, якія прадпрыемствы палепшылі вынікі фінансава-гаспадарчай дзейнасці і фактычна могуць праводзіць пэўныя стымулюючыя выплаты ці павышаць уласную тарыфную стаўку І разраду, — тлумачыць Алена Кузьміна. — Аднак больш важна, што адначасова мы бачым усе прадпрыемствы з нізкім узроўнем зарплаты, і ў выніку можам праводзіць аналіз рэзерваў яе росту, а таксама аказваць кансультацыйную дапамогу па рэгуляванню аплаты працы на падставе заканадаўства. Словам, па сутнасці ўплываць на выкананне планаў па павышэнню заробкаў, і прычым рабіць гэта загадзя.

Між тым, даводзіцца канстатаваць: сама камп'ютарная праграма маніторынгу будзе дапрацавана цягам бліжэйшых тыдняў. Такім чынам, на думку Алены Кузьміной, кантраляваць заробкі па адзінай «базе даных» на Міншчыне распачнуць ужо да канца сакавіка.

**Сяргей ГРЫБ.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# З Сіманавым пад Барысавам

**У лютым 1978 года на тэрыторыі Беларусі адбыліся вялікія вайсковыя вучэнні Савецкай Арміі пад кодавай назвай «Бярэзіна». У ходзе іх адпрацоўвалася ўзаемадзеянне мотастралкоў, танкістаў, авіятараў, дэсантнікаў, ракетчыкаў у наступленні і абароне.**



Зіма тады выдалася даволі снежная і марозная. Шырокае поле пад Халопенічамі, дзе пачыналіся вучэбныя «баі», было спрэс у сумётах. Танкі, якія першымі рушылі на пазіцыі «праціўніка» пасля артылерыйскай падрыхтоўкі, узнімалі суцэльную белую сцяну. Ланцуг наступаўшых за браніраванымі машынамі можна было выявіць толькі па ўспышках аўтаматных чэргаў.

За гэтай імклівай у складаных умовах атакай сачылі са спецыяльна пабудаваных вышак кіраўнікі Беларусі на чале з П.М. Машэравым, прадстаўнікі Міністэрства абароны СССР, шматлікія замежныя ваенныя назіральнікі, журналісты.

Пасля прарыву абароны ўмоўнага «праціўніка» войскі развівалі поспех, фарсіравалі раку Бярэзіну. А потым на палігоне пад Барысавам адбыліся баявыя стрэльбы ўжо ў штатным рэжыме. ПТУРСы вогненнымі кропкамі прачэрчвалі снегавую заслону, і навокал раздавалася глухое водгулле выбухаў, калі снарады прашывалі браніраваныя мішэні. Трашчалі аўтаматныя і кулямётныя чэргі. Нам, прыкамандзіраваным, было загадана не высоўвацца з бетоннага сховішча, назіраць за полем «бою» праз даволі вузкія амбразуры.

Але раптам нам дазволілі выбрацца наверх. Папярэдзілі: зараз прыбудуць яшчэ госці. І тут плаўна падкаціў чырвоны «Ікарус». Расчыняюцца дзверы, і з іх адзін за адным, усміхаючыся, ступаюць на заснежаную зямлю вядомыя беларускія і савецкія пісьменнікі. Справа ў тым, што якраз у гэтыя дні ў Мінску праходзіла Усесаюзная нарада пісьменнікаў, якія пішуць на ваенна-патрыятычную тэму.

Мы, журналісты, якія асвятлялі ход вучэнняў, аўтар гэтых радкоў, тады карэспандэнт «Звязды», і наш фотакарэспандэнт Мікола Амельчанка, прадстаўнік «Советской Белоруссии» Уладзімір Хачырашвілі сярод знакамітасцяў пазналі Канстанціна Сіманава. Адразу загарэліся жаданнем пагутарыць з ім. Прыгадаліся вядомыя сіманаўскія радкі: «Ты помнишь, Алеша, изба под Борисовом...», іншыя вершы з яго пранікнёнай ваеннай лірыкі. Тым больш што ўсю Вялікую Айчынную ён прайшоў ваенным карэспандэнтам «Красной Звезды», а пачынаў яшчэ на Халхін-Голе ў баях з японцамі.

І нам удалося прабіцца да Сіманава. Спыталі яго, ці часта ён бывае на падобных вучэннях. Не, адказаў Канстанцін Міхайлавіч, пасля вайны, вось упершыню прысутнічаю. Прыпомніў, што сюды, пад Барысаў, ён прыбыў у самым пачатку вайны («И дачный клязьминский вагон, в котором ехать мне до Бреста»...), што тут ён прыняў баявое хрышчэнне, тут сустрэў байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, у прыватнасці, палкоўніка Лізюкова, якія потым сталі прататыпамі герояў яго шырокавядомага рамана «Живые и мёртвые».

Вядома ж, нам карцела сфатаграфавацца з К.М. Сіманавым (калі яшчэ такое надарыцца!). М. Амельчанка пстрыкае колькі разоў затворам фотаапарата.

Пасля вучэнняў, калі схлынула неабходнасць у кожны нумар газеты даваць аператыўны матэрыял з месца падзей, Мікола прагледзеў праяўленую плёнку і выбраў вось гэты кадр (гл. фота) з К.М. Сіманавым (у цэнтры), зроблены 8 лютага 1978 года ў раёне г. Барысава ў час вайсковых вучэнняў «Бярэзіна».

**Мікалай ШЛОМА.**

## ХАЦЕЎ СКРАСЦІ БУНКЕР

**У Лепельскім раёне мясцовы жыхар разабраў законсерваваны камандны пункт адной з вайсковых часцей.**

Як расказалі ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, індывідуальны прадпрымальнік 1972 года нараджэння скраў 33 фундаментныя блокі і 6 жалезабетонных пліт. Урон ацэньваецца ў Br400 тыс. Цяпер «дбайнаму гаспадару» давядзецца адказваць за свой учынак у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Беларусі, адзначылі ва УУС.

**Вольга ДАВЫДАВА, БЕЛТА.**

## Агонь загубіў дзяцей

**У Крупскім раёне ў вёсцы Масленка ў агні загінулі двое дзетак, якія засталіся дома адны.**

Бяда здарылася каля а паловы сёмай вечара. Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, загарэўся дом 26-гадовай мясцовай жыхаркі. Будынак выгараў знутры: у ім былі знойдзены целы 7-гадовай дзяўчынкі, вучаніцы 1-га класа, і 5-гадовага хлопчыка — дзяцей гаспадыні дома. Паводле папярэдняй інфармацыі, прычынай пажару стала хутчэй за ўсё свавольства дзяцей з агнём. Маці каля 17 гадзін пайшла на працу, а дзяцей зачыніла ў хаце.

**Ігар ГРЫШЫН.**


## К сведению акционеров ОАО «Витебские ковры»

ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
**состоится 27 марта 2007 г. по адресу:**
**г. Витебск, ул. М. Горького, 75.**

Регистрация акционеров с 13.30 до 15.10 (иметь документ, удостоверяющий личность). Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров на 5 марта 2007 года.

***Начало собрания в 15.15.***

ПОВЕСТКА ДНЯ:

*1. Отчет об итогах работы Общества за 2006 год и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2007 год.*
*2. Отчет наблюдательного совета за отчетный период.*
*3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 год.*
*4. Утверждение годового баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2006 год.*
*5. О распределении чистой прибыли, полученной в 2006 году, и направлениях ее использования в 2007 году.*
*6. О выплате дивидендов за 2006 год.*
*7. Об увеличении уставного фонда Общества.*
*8. Утверждение Устава ОАО «Витебские ковры» в новой редакции.*
*9. Выборы членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.*
*10. Утверждение условий вознаграждения для членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.*

**С материалами собрания можно ознакомиться с 19 по 26 марта (с 9.00 до 16.00) в кабинете специалиста по ценным бумагам.**

**Наблюдательный совет ОАО «Витебские ковры».**

**Тел. 34-09-47.**

## Уважаемые акционеры ОАО «Технобанк»!

Настоящим извещаем о проведении очередного годового Общего собрания акционеров ОАО «Технобанк» в **очной форме**.
Дата проведения: 27 марта 2007 года.
Место проведения:
актовый зал РУП «Белгипроводхоз» по адресу:
г. Минск, пр. Машерова, д. 25, 2-й этаж.
Регистрация участников Общества для участия в собрании:
с 10.00 до 11.00.
Время проведения заседания: с 11.00 до 14.00.

**Повестка дня общего собрания акционеров:**

1. Об утверждении заключения ревизионной комиссии ОАО «Технобанк» по годовому отчету (бухгалтерскому балансу, отчету о прибыли и убытках и др.) за 2006 год.
2. Об утверждении годового отчета (бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках и др.) за 2006 год.
3. О распределении прибыли ОАО «Технобанк» за 2006 год.
4. О нормативах распределения прибыли ОАО «Технобанк» на 2007 год.
5. О выплате дивидендов за 2006 год.
6. Об установлении размера дивидендов по привилегированным акциям на 2007 год.
7. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
8. О реализации рекомендаций Национального банка Республики Беларусь в соответствии с Основными направлениями денежно-кредитной политики Республики Беларусь на 2007 год, утвержденными Указом Президента Республики Беларусь от 30 ноября 2006 года № 703.
9. Об избрании членов ревизионной комиссии ОАО «Технобанк».
10. Об избрании членов Совета Директоров ОАО «Технобанк».
11. О порядке доведения решений, принятых на очередном годовом общем собрании акционеров ОАО «Технобанк» 27 марта 2007 г., до сведения его участников.

**Для регистрации с собой необходимо иметь:**
**паспорт (для физических лиц),**
**удостоверение руководителя и печать**
**(для юридических лиц)**
**либо иной документ, подтверждающий полномочия!!!**

Для получения дополнительной информации обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу:
**г. Минск, ул. Кропоткина, 44,** телефон (017) 237 43 80

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г.

## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «СЛУЦКИЙ САХАРОРАФИНАДНЫЙ КОМБИНАТ»!

**(расположено по адресу: 223610, г. Слуцк, ул. Головащенко, 6)**

***23 марта 2007 года во Дворце культуры сахарорафинадного комбината по адресу: г. Слуцк, ул. Головащенко, 6 в 14.00 состоится очередное общее собрание акционеров и представителей акционеров открытого акционерного Общества «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».***

ПОВЕСТКА ДНЯ:

*1. Отчет о результатах деятельности Общества за 2006 год и направлениях развития на 2007 год:*
- *Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков за 2006 год;*
- *Утверждение распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества, за 2006 год;*
- *Утверждение исполнения смет внереализационных и операционных доходов и расходов за 2006 год;*
- *Утверждение отчетов Дирекции, наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.*

*2. Утверждение направлений и нормативов распределения нераспределенной прибыли, остающейся в распоряжении Общества после налогообложения и других обязательных платежей, смет операционных и внереализационных доходов и расходов на 2007 год и I квартал 2008 года.*
*3. Утверждение размера выплаты дивидендов за 2006 год, порядка и сроков их выплаты, порядка и сроков выплаты дивидендов по 2007 году.*
*4. Утверждение условий вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.*
*5. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.*
*6. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.*
*7. Утверждение Устава Общества в новой редакции.*
*8. О вступлении Общества в состав участников Союза сахаропроизводителей России в качестве иностранного ассоциированного члена.*
*9. О даче согласия на увеличение Уставного фонда СУП «Агросервис-ССК» путем передачи на его баланс двух свеклоуборочных комбайнов Holmer (инв. № 12826 2002 г. выпуска, инв. № 12905 1995 г. выпуска) по оценочной стоимости.*
*10. О даче согласия на увеличение доли Республики Беларусь в уставном фонде Общества на сумму части процентов, подлежащих уплате за пользование бюджетным займом.*

Список акционеров для регистрации участников собрания составляется на 01.03.2007 г. Регистрация акционеров и их представителей будет осуществляться в день проведения собрания с 13.00 до 14.00 по месту его проведения. Представителям акционеров при регистрации иметь паспорт, доверенность, оформленную в установленном порядке, акционерам — паспорт. Информацию (материалы) по вопросам повестки дня можно получить: в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по месту нахождения Общества, начиная с 16 по 22 марта 2007 года (тел. 45-3-28, 45-0-91), а в день его проведения — по месту проведения.

**Наблюдательный совет ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».**

## ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

**29 марта 2007 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5**
**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА**
**республиканской собственности, расположенного в д. Седча Пуховичского района Минской области, закрепленного на праве хозяйственного ведения за производственным республиканским унитарным торфопредприятием «Сергеевичское».**

*На аукционные торги выставляется лот:*

Здание автогаража с пристройкой одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, крыша шиферная, полы бетонные. Имеется электроосвещение. Инженерные коммуникации отсутствуют. Общая площадь здания 238,2 кв. м, введено в эксплуатацию в 1954 году.

Лот расположен на земельном участке общей площадью 97,94 га, предоставленном вышеназванному предприятию согласно решению Пуховичского райисполкома от 31 января 1996 г. № 1-71. Победителю аукциона земельный участок будет предоставлен в установленном законодательством порядке.

***Аукцион проводится без условий.***
**Начальная цена продажи 6000,0 тыс. рублей.**
**Сумма задатка — 500,0 тыс. рублей.**

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

1. Подписать договор купли-продажи объекта в течение 10 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
2. Произвести оплату объекта в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи разовым платежом.

Все расчеты по сумме задатка производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3632900000952 в ОПЕРУ АСБ «Беларусбанк» в г. Минске, код 795 ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

*Заявки принимаются до 15.00 28 марта 2007 года.*
***По вопросам подготовки и проведения аукциона обращаться:***
***г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 329,***
***тел.: 224-57-09, 8 (01713) 624-51, 624-57.***


## Простыя рэчы

# ДЗВЕРЫ

Прыемна, калі мае расказы пра простыя рэчы сустракаюць у чытачоў нераўнадушны водгук. Вось і пасля «Праса» рэдакцыя «Звязды» пераслала мне ліст ад Алеся Белакоза з вёскі Гудзевічы Мастоўскага раёна на Гродзеншчыне. Ён вельмі прыгожа распавядаў пра патрэбнасць і вялікае значэнне апісанага мною валка і качалка, якія многія берагуць да сённяшняга дня.

Ну а цяпер пра дзверы.

*Ляснуць дзверы —*
*У сусвет.*
*Зоры скалануцца.*
*Скажа спуджаны сусед:*
*«І не спіцца ж людцам».*
*Раззлавана рыпне снег:*
*«І куды іх носіць...»*
*Па сумётах — з хаты —*
*Смех прабяжыцца босы.*

Радкі гэтыя напісаліся яшчэ ў сямідзесятыя. А цяпер вось чамусьці ўспомніліся. Вырашыў напісаць пра простую, можа, па нашых часах і не зусім простую рэч — дзверы.

Неяк прыехаў у Мінск. Спраў было зашмат, вырашыў усе толькі пад вечар. Сцямнела. А дзе заначаваць? Гатэлі па тым часе перапоўненыя. Ткнуўся ў адзін, у другі — месцаў няма. Давялося ехаць да стрыечнага брата. Падыходжу да яго пад'езда — а дзверы не простыя, з кодам. Які ён? Магчыма, па нумару кватэры. Толькі і нумара не памятаю. Памятаю, што сёмы паверх, што ад ліфта ўправа. А нумара кватэры ў памяці не засталося. Сеў на лавачку каля пад'езда і сам сабе разважаю: ехаць на вакзал і чакаць першага аўтобуса на родныя Паставы. І каменьчыкам у братава акно не дакінеш — завысака. І тут на маё шчасце да ўваходных дзвярэй падышла маладая парачка. Цалуюцца на развітанне. Я да дзвярэй.

— Ці ўпусціце?

— А вы хто, не злодзей?

— Ды проста чалавек, да радні дабрацца не магу.

Набрала дзяўчына нейкі нумар, дзверы адчыніліся. З той нагоды я і ліфтам не карыстаўся, узбег да брата на сёмы.

Такія вось дзверы.

Яшчэ на маёй памяці ў роднай вёсцы ніхто не замыкаў дзвярэй. Накінуць клямку — значыць, гаспадароў дома няма. А зладзеяў не баяліся. Іх проста не было. З'явіліся пазней.

І вось выбарачная і непрадказальная памяць. У рускага класіка, які, магчыма, крыху прызабыты нават рускімі, ёсць раман «Поднятая целина». Некалі яго крыху і асуджалі за празмернае ўхваленне калгаснага будаўніцтва. А раман у Шолахава цікавы, з вельмі яркімі вобразамі, сітуацыямі. Але ж пра дзверы...

Прывяду два ўрыўкі. Андрэй Размётнаў прыйшоў перакрываць страху да маладой удавы. Папрацаваў, наеўся.

*«— А можа ў мяне заначуеш?*

*— І гэта можна, — не знайшоў нічога іншага сказаць разгублены Андрэй.*

*І Марына, помсцячы за недарэчнае слова, сагнула ў паклоне паўнеючы стан.*

*— Вось-вось і дзякуй, кармілец! Заўважыў бедную удаву... А я ж, грэшная, баялася, думала — адмовішся...*

*Яна хуценька дунула на газоўку, у поцемках пасцяліла ложак, заперла на засоўку дзверы».*

Гэта пра дзверы з усмешкай. А ёсць жа ў тым рамане эпізод, калі белы афіцэр з кулакамі прыходзіць забіваць сям'ю таксама кулака, але чалавека, які вырашыў іх выдаць.

*«Па некранутаму снегу пайшлі ваўчынай цэпкай, крок у крок. Каля весніц у двор Якаў Лукіч прыціснуў далонь да левага боку, самотна шапнуў:*

*— Госпадзі...*

*Полаўцаў паказаў на дзверы.*

*— Стукайся!... — хутчэй здагадаўся па вуснах, чым пачуў Цімафей.*

*Лёгенька бразнула клямка...»*

Такія вось дзверы. Раней яны ў беларусаў называліся крыху інакш — **дзверны, дзвернік, дзверніца, вярэі.** Вярэі — гэта дзверы з двух палавін, створак. Сучасныя дзверы, канешне, зусім іншыя. Некалі была мода на металічныя, ледзь не браніраваныя. Але цяпер і новыя беларусы пачалі разумець, што дзверы з дрэва намнога лепшыя, натуральней і цяплейшыя нават не толькі таму, што не настываюць, а таму, што грэюць вока, лашчаць руку пры дотыку.

Служыў некалі ў пастаўскім гарнізоне прапаршчык Бабічаў. Нармальна служыў, нічым не вызначаўся. Ды вось не стала ў горадзе вайсковых часцей, пайшлі вайскоўцы, у тым ліку і ён, на пенсію. І тут вырашыў арганізаваць сваю справу. Вырабляць дзверы з дрэва. Пачыналі ў гаражы. А сёння ў яго фірме вялікія памяшканні, працуе некалькі соцень людзей. А дзверы, сапраўды файныя, ідуць у асноўным за межы Беларусі. Да гонару прадпрымальніка ён не падграбае ўсё пад сябе, выступае фундатарам у многіх гарадскіх культурных, спартыўных мерапрыемствах, дапамагае дзецям.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пішу, а сам усё вяртаюся да прыведзенай вышэй цытаты, пра ўдаву, якая закрывала дзверы.

Дзверы рыпнулі... Ат, сёння, калі ўнучка ўжо пойдзе ў школу, відаць, можна нагадаць і гэта. Бо, помніце, і ў Пушкіна ёсць: «Я это потому пишу, что сам уж больше не грешу». У суседа вяселле, я, шаснаццацігадовы дзяцюк, дзесяцікласнік, запрошаны. Тады ў нас было абсалютна нармальным, што ў такім узросце за стол садзіліся і выпівалі нароўні з мужчынамі, зразумела, спявалі і танцавалі таксама. І вось маладзён аблізнуўся на адну са сваццяў, кабету гадоў пад трыццаць, без мужа. А яна якраз спынілася ў нашай хаце, у суседа ад гасцей цесна. Кабета таксама выказала нейкія памкненні. Дамовіліся. Яна вечарам пайшла да маёй хаты першай. Я крыху пазней для канспірацыі. А вяселле ў разгары.

І вось я, як той марцовы каток, прабіраюся ў яе пакой, толькі прыступаю да абдымкаў, як — дзверы рыпнулі. У хату заходзіць маці, якая ўсё-такі выпільнавала нас. З вясельнага стала ў яе руках быў ручнік для выцірання посуду. Гэтым ручніком я і атрымаў. Добра, што не апалоўнік патрапіў у яе рукі.

А ўвогуле дзверы і ў прамым, і ў пераносным сэнсе прысутнічаюць у многіх устойлівых выразах.

**Глухія дзверы** — яны для формы, а не для карыстання.

**Царскія дзверы** — гэта ў царкоўным іканастасе.

**Дзверы не зачыняюцца** — шмат людзей бывае ў гэтым памяшканні.

**Дзверы ў дзверы** — жыць насупраць.

**Дзень адчыненых дзвярэй** — цяпер і ў войску нават іх арганізуюць.

**Ламацца ў адчыненыя дзверы** — рабіць што-небудзь бессэнсоўнае.

**Пры зачыненых дзвярах** — таемна, толькі сваёй грамадой.

**Паказаць на дзверы** — выдаліць чалавека ад сябе...

Такая вось простая рэч — дзверы. Няхай да добрых людзей, нават у сусвет, яны ў вас заўсёды будуць адчыненыя.

**Алесь КАСЦЕНЬ.**
*Віцебская вобласць.*

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

23 ЛЮТАГА 2007 г. ПЯТНІЦА № 8 (15459)

Руслан ТРУХАН:

# «АД СЁННЯШНЯЙ МОЛАДЗІ ЗАЛЕЖЫЦЬ, ЯКОЙ БУДЗЕ НАША КРАІНА ЗАЎТРА»

**З Русланам Труханам, першым сакратаром Мінскага абласнога камітэта БРСМ, чытачы «ЧЗ» знаёмыя: інтэрв'ю з ім выходзіла якраз у дзень сустрэчы Прэзідэнта краіны з лідарамі маладзёжных арганізацый — 20 кастрычніка мінулага года. Тады Руслан расказаў пра дзейнасць абласной арганізацыі. Сённяшняя сустрэча — спроба паразважаць пра сэнс звыклых для нас слоў: патрыятызм, гістарычная памяць. Якое яны маюць дачыненне да арганізаванай моладзі? Навошта моладзі ўвогуле быць арганізаванай? Руслан Трухан упэўнены, што цікаўнасць маладых людзей да Саюза сёння якасна іншая.**



***— БРСМ лічыць сябе патрыятычнай арганізацыяй. Ды і іншыя арганізацыі, у тым ліку і нефармальныя, таксама лічаць сябе такімі — яны размаўляюць на беларускай мове, шануюць гісторыю свайго народа. Ці ёсць, на ваш погляд, розніца паміж разуменнем патрыятызму першых і другіх?***

— Для мяне патрыятызм — любоў да радзімы, а гэта і да бацькоў, і да продкаў, да свайго дому, школы і гэтак далей... Гэта — аснова патрыятызму. Што датычыцца мовы, то я лічу, што адукаваны чалавек павінен ведаць некалькі моў, і, натуральна, сваю родную. Я з вялікай павагай стаўлюся да беларускай мовы. Некалі скончыў з чырвоным дыпломам факультэт беларускай філалогіі педуніверсітэта. Але я не лічу патрыятычным прасіць аб санкцыях да Беларусі, хай нават і на беларускай мове. Жадаць дрэннага свайму народу, сваім знаёмым — гэта не патрыятызм. Мне здаецца, што БРСМ увогуле, і я, як лідар Мінскага абласнога камітэта, раблю ўсё магчымае, каб Міншчына працвітала. Нашы напрамкі і праекты, якімі мы займаемся, з'яўляюцца сацыяльна значнымі.

***— А як вы развіваеце інтарэс у моладзі да гісторыі краіны і беларускай мовы?***

— Прыклад першы. Мінскі абласны камітэт ужо два гады праводзіць конкурс маладых журналістаў. Раней канкурсанты падзяляліся на тры групы: аматары, якія вучацца; аматары, якія працуюць; прафесіяналы — тыя, што працуюць у газетах. Сёлета кола ўдзельнікаў мы пашырым. Тэматычныя намінацыі «Беларусь Родная», «Беларусь Сінявокая» і «Беларусь Маладая» (былі ў 2006 годзе) так ці інакш кранаюць гісторыю нашай краіны. Да нас прыслалі 371 работу. І ведаеце, амаль што 80 працэнтаў артыкулаў, якія нам дасылала моладзь, былі на беларускай мове. Калі мы запрасілі ўдзельнікаў конкурсу для падвядзення вынікаў, то я заўважыў, што шмат хлопцаў і дзяўчат сярод удзельнікаў размаўлялі толькі на беларускай мове.

Свайго сямігадовага сына Багдана я таксама вучу мове нашых дзядоў, чытаю яму казкі на беларускай мове, і ён ужо ведае ўсе беларускія літары. Ведаць сваю родную мову павінен кожны адукаваны чалавек, але на якой размаўляць — гэта ўжо асабісты выбар.

***— Руслан, а навошта ўвогуле арганізоўваць моладзь?***

— Калі дзяржава не будзе дапамагаць маладым, то хто будзе? У савецкі час камсамол працаваў з дзецьмі пачынаючы са школьнай парты і да таго часу, пакуль малады чалавек «не станавіўся на ногі». Тады камсамол займаўся ўсімі сацыяльна значнымі напрамкамі: а гэта і здаровы лад жыцця, і экалагічнае выхаванне, і патрыятычнае... Усё тое добрае, чым займаўся камсамол, мы зараз адраджаем.

У 90-х гадах, калі Саюз моладзі Беларусі існаваў быццам сам па сабе, ён не мог існаваць так як трэба. Вырасла цэлае пакаленне моладзі, якой ніхто не займаўся, — яны былі прадастаўленыя самі сабе, вуліцы. Гэтым хлопцам і дзяўчатам ніхто не гаварыў, што трэба пасадзіць дрэўца, сачыць за чысцінёй у сваім класе, вакол школы, каля свайго дома, сваёй вуліцы.

А зараз паглядзіце: як толькі снег сышоў, БРСМ арганізоўвае моладзь, і яна прыводзіць у парадак свае гарады, вёскі, садзіць дрэвы, прыбіраецца ў парках. Прыемна, калі вакол прыгожа і чыста. Яшчэ не так даўно для гэтага трэба было хлопцаў і дзяўчат ледзь не сілком зганяць, зараз жа моладзь, у большасці, сама ўсведамляе, наколькі гэта важна.

***— А дома лепш: можна чай папіць... Чаму падлеткам важна, напрыклад, помнікі прыбіраць?***

— Мы сёння ўкладваем у розум маладых людзей тое, што без ведання гісторыі, без павагі да яе немагчыма самаўдасканальванне. Калі ёсць помнік, то ён не проста так пастаўлены, а для таго, каб памяталі...

Праз 20—30 гадоў сённяшняя моладзь будзе кіраваць краінай, і ад таго, наколькі яна ўсведамляе любоў да радзімы, паважае яе мінулае, будзе залежаць яе выбар. Я лічу, чым больш малады чалавек будзе займацца грамадска значнай дзейнасцю, тым больш ён будзе даражыць сваёй краінай.

***— Але які ж вы прымяняеце механізм для «ўкладання ў розум» такіх важных, але занадта абстрактных рэчаў?***

— Моладзь сама ідзе да нас праз клубы, праз розныя мерапрыемствы. Напрыклад, знакамітая гульня «Орленок». Калі я з маладымі людзьмі сядзеў ля вогнішча, то спытаў у іх, ці цікава ім гэта. І яны адказалі: канешне, давайце яшчэ што-небудзь падобнае прыдумаем. Маладым цікава разам, а мы іх энергію накіроўваем на клопат аб развіцці асобы, аб здароўі, аб іміджы Беларусі ў свеце...

***— Вы сказалі пра клубы: чым яны займаюцца?***

— Гэта клубы па інтарэсах. Іх шмат па ўсёй Мінскай вобласці. Той самы клуб «Маладых журналістаў» — гэта ідэя нашага камітэта. Калі я вучыўся ў школе, то хацеў стаць журналістам. У той час не было ніякіх клубаў: камсамол толькі развaліўся, у Мінску стварылі Беларускі саюз моладзі, але я не бачыў у Салігорску, дзе жыў, ніякіх пярвічак гэтай арганізацыі. Мне проста не хапіла ўпэўненасці ў самім сабе. Моладзь у Салігорску была нібыта адрэзаная ад свету, і паступіць у БДУ на факультэт журналістыкі здавалася нязбытнай марай. Магчыма, калі б быў у той час такі клуб, мы б з вамі былі калегамі.

Ствараюць клубы звычайна самі маладыя людзі, а мы дапамагаем. Аднаму падабаюцца матацыклы, другому рыцары... І вось, напрыклад, малады чалавек вырашыў стварыць рыцарскі клуб. Ён звяртаецца з ідэяй да першага сакратара райкама БРСМ. А сёння сакратар — гэта практычна член райвыканкама — ён прысутнічае на ўсіх пасяджэннях райвыканкама, прапануе нейкія ідэі... Такім чынам, клубы ў раёнах часцей за ўсё працуюць пры падтрымцы тэрытарыяльных камітэтаў БРСМ. Аднак, дапамога тут узаемная. Мы ім дапамагаем вырашаць арганізацыйныя пытанні, а яны ўдзельнічаюць на нашых мерапрыемствах, робячы іх больш цікавымі — той жа рыцарскі турнір. І ім цікава, і нам.

У нас таксама ёсць цікавы для маладых людзей мотаклуб. Я некалькі разоў з задавальненнем прысутнічаў на іх моташоу. Райкам дамаўляецца з ДАІ, МНС, «хуткай дапамогай», без якіх такое шоу праводзіць нельга. Прыходзіць шмат балельшчыкаў... Разумееце, гэтыя клубы адцягваюць маладых людзей ад лайдацтва і п'янства...

***— Вы неяк заахвочваеце актывістаў?***

— Грошы мы ім за гэта не плацім. Але наша арганізацыя дапамагае маладым грошы зарабіць. Магчымасцяў шмат: і студэнцкія атрады, і камсамольскае будаўніцтва, і дапамога ў працаўладкаванні падчас канікулаў. Ёсць у нас яшчэ адзін від заахвочвання — скідкі. Невялікія, але вельмі прыемныя. Амаль што ў кожным маленькім горадзе і нават пасёлку Мінскай вобласці існуюць скідкі для членаў БРСМ. Напрыклад, у гарадскім пасёлку Станькава — 20-працэнтная скідка на заняткі шэйпінгам. У Мядзелі — да 50 працэнтаў скідка на абеды ў кафэ «Сад». Ёсць скідкі і на пакупку адзення, прадуктаў, дыскаў і іншага. Ёсць скідкі на пракат вясельных убораў, рамонт адзення і жылых памяшканняў.

Сёння маладым цяжка, і я лічу, што гэта добра, калі не толькі дзяржава, але і нейкія прадпрыемствы дапамагаюць ім.

**Гутарыла Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

## ПАТРЫЯТЫЗМ АД МАЛАДЫХ

**Напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны Цэнтральны камітэт БРСМ адзначыў лепшыя пярвічкі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і пагранічных войскаў. Тым самым была распачата рэспубліканская акцыя «Служым Беларусі!».**

— Дэвіз акцыі «Мы — унукі салдат Вялікай Перамогі!», — адзначыў першы сакратар ЦК БРСМ Леанід Кавалёў, — адлюстроўвае яе патрыятычную накіраванасць, сувязь пакаленняў і аб'ядноўвае розныя сацыяльныя групы моладзі: вайскоўцаў, навучэнцаў, студэнтаў і працоўную моладзь.

У рамках акцыі, якая будзе доўжыцца да 28 мая.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**




*Першы сакратар ЦК БРСМ Леанід КАВАЛЁЎ уручыў пераходзячы вымпел сакратару лепшай пярвічнай арганізацыі БРСМ Узброеных Сіл па выніках 2006 года старшаму лейтэнанту Андрэю ЖУКАВУ.*

Наш фармат

## ДЗЕЦІ СУПРАЦЬ ГАЛЕЧЫ

**Сакратарыят ААН абвясціў Міжнародны дзіцячы конкурс на лепшы дызайн паштовых марак. Прысвечаны яны будуць тэме барацьбы з галечай. Серыя так і называецца — «Мы здолеем знішчыць галечу». Да яе стварэння запрашаюцца ўсе жадаючыя юныя мастакі, каму ад 5 да 15 гадоў, незалежна ад краіны пражывання.**

Паводле ўмоў конкурсу, да разгляду прымаюцца работы на стандартным аркушы паперы А4, выкананыя чарнілам, маркерам, крэйдамі, фарбамі, алоўкамі ці іншым падыходзячым матэрыялам.

На адваротным баку малюнка ўдзельніку неабходна будзе пазначыць свой узрост, пол, поўнае імя, адрас (у тым ліку тэлефон і электронную пошту, калі яны маюцца). Заяўкі прымаюцца на адрас: International Children's Art Completition, 2 United Nations Plaza, Room 1328, New York, NY 10017, United States of America — да 30 чэрвеня гэтага года.

Журы, складзенае ААН, абвесціць свой вердыкт і вызначыць 26 эскізаў-пераможцаў 6 кастрычніка 2007 года. 6 лепшых эскізаў будуць выдадзены як серыя паштовых марак: 2 з іх паступяць у абарачэнне ў Нью-Йорку, 2 — у Жэневе і 2 — у Вене. Аўтары яшчэ 20 эскізаў будуць адзначаны заахвочвальнымі прызамі. Акрамя таго, усе эскізы возьмуць удзел у спецыяльным выставе ААН, прымеркаванай да Міжнароднага дня барацьбы за ліквідацыю галечы.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## Беларусіяда — беларуская студэнцкая алімпіяда

**Цікавую альтэрнатыву традыцыйным спартыўным спаборніцтвам прапанавалі выкладчыкі і студэнты Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка — правядзенне масавай студэнцкай Беларусіяды. Паводле слоў выкладчыка кафедры фалькларыстыкі БДПУ Анатоля Дрыгіна, з аднаго боку Беларусіяда — гэта спартыўнае мерапрыемства, а з іншага — культуралагічнае, паколькі скіраванае на папулярызацыю народных відаў спорту.**

Лапта, рыбакі, стральба з рагаткі, два агні, падцяг і перацяжкі — з тых відаў спартыўнай праграмы маладым беларусам больш-менш зразумелая толькі стральба з рагаткі і лапта. Але беларуская лапта мае свае адметнасці: усяго на тэрыторыі Беларусі сустракаюцца ад 5 да 7 відаў варыянтаў лапты. Самая «беларуская» лапта ў рэшце рэшт і была ўключана ў праграму Беларусіяды.

Удзел у спаборніцтвах прымаюць мужчынскія і жаночыя каманды. Мінімальная колькасць удзельнікаў для мужчынскіх каманд — 11 чалавек і 7 чалавек — для жаночых. Незвычайным з'яўляецца тое, што ад удзельнікаў патрабуецца праявіць не толькі спрытнасць і выдатную фізічную форму, але таксама акцёрскія і тэатральныя здольнасці, паколькі абавязковая праграма прадугледжвае фальклорную частку, дзе ацэньваецца відовішчнасць і арыгінальнасць кожнай каманды.

Студэнты БДПУ летась ужо правялі сваю Беларусіяду і намераваюцца даказаць яе перспектыўнасць на рэспубліканскім узроўні. Плануецца, што праз год—паўтара ўдасца правесці агульнарэспубліканскую студэнцкую Беларусіяду. Паводле слоў Анатоля Дрыгіна, для таго, каб падрыхтаваць інструктараў па народных гульнях і сфарміраваць каманды, спатрэбіцца пэўны час. Удзельнікам камандам яшчэ трэба і патрэніравацца. Заўважана, што падчас трэніровак кожная каманда спрабуе выпрацаваць сваю стратэгію, якая дапамагае перамагчы. Проста добрай фізічнай падрыхтоўкі можа аказацца недастаткова для перамогі...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## «Сідхартха» ад Арашонка

**Віцябчан і не толькі жыхароў Прыдзвіння, але і ўсіх, хто цікавіцца навінкамі літаратуры, прыемна здзівіў малады мясцовы перакладчык Арцём Арашонак.**

Ён за асабістыя грошы надрукаваў уласны беларускі пераклад кнігі Нобелеўскага лаўрэата па літаратуры Германа Гесэ «Сідхартха» на беларускую мову. Над перакладам хлопец працаваў тры гады, амаль столькі ж ствараўся і арыгінальны твор (1919—1921). І Арцём цалкам ажыццявіў даўнюю сваю мару. З гэтым яго павіншавалі віцебскія інтэлектуалы і нават дыпламаты: ганаровы Генеральны консул Швейцарыі і афіцыйны прадстаўнік пасольства Германіі даслалі энтузіясту адпаведныя лісты. Сёлета ў Еўропе святкуецца 130-годдзе Гесэ — пісьменніка і мастака. Цікава, што сам Янка Купала яшчэ ў 1923-м пераклаў верш Гесэ «У імгле». А Гесэ, наадварот, «адкрыў Еўропе частку купалаўскай творчасці». Былі і іншыя перакладчыкі — аматары твораў Гесэ.

Арцём Арашонак нарадзіўся ў 1981-м. У 2004-м скончыў Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава. Пакуль што, як кажуць, «на вольных хлябах». Тыраж перакладу «Сідхартхі» невялікі: каля 300 экзэмпляраў. Між іншым, праз Інтэрнэт яго кніга паспяхова прапаноўваецца ў «віртуальнай краме»... Сам перакладчык па больш прывабнай цане распаўсюджвае кнігу сярод зацікаўленых знаёмых. Дзіўна? Нават чарга з'явілася ў памяшканні віцебскай «Музычнай гасцінай» з ліку жадаючых атрымаць экзэмпляр з аўтографам перакладчыка.

Выбар «Сідхартхі» для перакладу, як тлумачыць Арцём Арашонак, быў абумоўлены культурнай значнасцю, глыбінёй гэтага твора («Сідхартха» перакладзена на ўсе найбольш распаўсюджаныя мовы, а таксама на 12 дыялектаў Індыі!).

Між іншым, «Сідхартха» ў 1970-я, аказваецца, карысталася вялікай папулярнасцю сярод моладзі. Бо аўтар Гесэ (1877—1962) у свой час пакінуў сям'ю, жыў у асяроддзі самай беднай касты ў Індыі, пазнаў любоў, але ж адмовіўся ад жанчыны, разбагацеў, потым адмовіўся і ад вялікіх грошай... Мо такім чынам і можна стаць Нобелеўскім лаўрэатам?

Малады таленавіты перакладчык рыхтуе да выдання і іншыя кнігі не менш знакамітых нямецкамоўных аўтараў: гэта Э.М. Рэмарк («Восеньскае падарожжа летуценніка»), Паўль Маара («Якаб і бамбіза»).

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## У пошуку будучых Ламаносавых

**Міністэрства адукацыі і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт праводзяць з 23 па 25 лютага адзінаццатую рэспубліканскую канферэнцыю навучэнцаў агульнаадукацыйных устаноў. Галоўная мэта гэтага мерапрыемства — выяўленне адораных дзяцей, якія могуць скласці ў будучыні навуковую эліту Беларусі.**

На папярэднім этапе журы адабрала з 300 заяўленых 162 работы. Школьнікі будуць абараняць іх перад сваімі равеснікамі і прадстаўнікамі журы. Дарэчы, у журы ўваходзяць 8 дактароў і 29 кандыдатаў навук. Лепшыя работы будуць адзначаны дыпломамі Міністэрства адукацыі, а таксама прадстаўлены на міжнародных канферэнцыях школьнікаў, якія пройдуць у Расіі, Іспаніі і ЗША. Акрамя таго, пераможцы будуць рэкамендаваныя для заахвочвання спецыяльным фондам Прэзідэнта па падтрымцы адоранай моладзі. Летась, напрыклад, са 135 дакладаў 45 былі адзначаны дыпломамі рознай ступені.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Узнагароды спецыяльнага фонду прэзідэнта Беларусі — лепшым навучэнцам Мінска

**Узнагародамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы таленавітых навучэнцаў і студэнтаў адзначаны 19 навучэнцаў Мінска. Урачыстая цырымонія ўшаноўвання адбылася ў Мінскай гарадской ратушы.**

Лаўрэатамі фонду сталі 6 навучэнцаў — пераможцаў у мінулым годзе міжнародных прадметных алімпіяд і 13 — пераможцаў рэспубліканскіх конкурсаў прафесійнага майстэрства. Сёння хлопцы і дзяўчаты атрымалі кветкі і грашовыя ўзнагароджанні. Пасведчанні і значкі лаўрэатаў ім будуць уручаны на сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі ў маі гэтага года.

Выступаючы на цырымоніі, намеснік старшыні Мінгарвыканкама Міхаіл Ціцянкоў адзначыў, што сённяшняе ўшанаванне — знак прызнання на дзяржаўным узроўні заслуг самых таленавітых, паспяховых і мэтанакіраваных навучэнцаў. Пры гэтым ён асабліва падкрэсліў, што многія навучэнцы сталі ўладальнікамі такой высокай узнагароды не першы раз. «Гэта здорава, што мы ў вас не памыліліся і вы развіваеце свой талент, павялічваючы тым самым інтэлектуальны рэсурс краіны», — сказаў Міхаіл Ціцянкоў.

**Кар. БЕЛТА.**

## УСЕ НА СПАРТЛАНДЫЮ!

**У Дубровенскім раёне Віцебскай вобласці прайшлі спартландыі для мясцовай моладзі, якая вучыцца, і для тых, хто працуе ў вёсцы.**

Адна з іх адбылася, напрыклад, на базе сельгаспрадпрыемства «Заруба». Больш за сто маладых спецыялістаў бралі ўдзел у спаборніцтвах па міні-футболу, настольнаму тэнісу, валейболу... Арганізавалі свята спорту райкам БРСМ і райвыканкам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**




**У Гродне адбыўся адборачны рэгіянальны тур «Увасабленне», які праходзіць у рамках рэспубліканскага конкурсу моды і фота «Млын моды». Паводле вынікаў тура дзесяць калекцый гродзенскіх дызайнераў аддзення адабраны на рэспубліканскі конкурс, які пройдзе ў Мінску на пачатку мая.**

# ГАРЫЦЬ «КУРСАЧ»? МЫ ВЫЯЗДЖАЕМ!

**Студэнт і халява — непадзельныя паняцці. І паесці ім хочацца на халяву, і на спектакль схадзіць, і вандраваць паехаць аўтастопам... Нават вучыцца спрабуюць не свaёй галавой...**

**«Памятаю, цягалі курсавыя і рэфераты з Інтэрнэту, — узгадвае ўчарашні студэнт. — Альбо злёгку змянялі чужую працу, а малюнкі карэктавалі ў Paint'е. Даволі часта «курсачы» пісалі шляхам скaніравання на камп'ютары кніг па тэме (гэта мой выпадак). У каго ж быў сканер, нават распачыналі невялікі бізнэс — адна праца каштавала 9 долараў. Ну а на крайні выпадак карысталіся аб'явамі накшталт «дапамагу ў напісанні курсавых, дыпломных...».**

Вам, напэўна, цікава, колькі каштуе такая халява? Бо правільна кажуць: бясплатным бывае толькі сыр у мышалоўцы (і то яго кошт — жыццё). Пагуляла я па некалькіх сайтах глабальнай сеткі і... заўважыла наступную заканамернасць: сярэдні кошт за напісанне рэферата — 20 тысяч рублёў, кантрольнай — 30, курсавой — 40 (тэарэтычная частка), 60 (практычная), справаздачы па практыцы — 60, дыплома — 200—300 тысяч рублёў. Такія паслугі замежным студэнтам абыдуцца даражэй. Канечны кошт устанаўліваецца ў залежнасці ад складанасці працы.

### ТАБУ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАМУ ПАДМАНУ

— Да заказу дыпломных і курсавых работ адношуся, як і любы выкладчык, негатыўна, — дзеліцца ўласнымі думкамі дацэнт кафедры крымінальнага права, кандыдат юрыдычных навук, член вучэбна-метадычнай камісіі юрыдычнага факультэта БДУ Андрэй Віктаравіч Шыдлоўскі. — Такі сродак вучобы пазбаўляе студэнта ўсякага творчага пачатку. Гэта, на мой погляд, інтэлектуальны падман.

На кожным факультэце маецца банк дыпломных работ. Дзякуючы яму можна адсочваць плагіят. Калі работа там не ўсплывае, у распараджэнні выкладчыка — архіў.

— Кожны год на першым пасяджэнні кафедры перазацвярджаецца тэматыка дыпломных і курсавых работ. І, я ўпэўнены, гэта правільны крок. Адваротнае заведама падштурхоўвае студэнта, які любіць халяву, да выбару, а пасля і заказу стандартнай работы.

Паводле слоў Андрэя Віктаравіча, вопытны выкладчык звычайна ведае ўзровень ведаў кожнага студэнта, з якім працуе, яго здольнасці. Таму яму не спатрэбіцца прыкладаць шмат намаганняў, каб вызначыць, што гэту курсавую ці рэферат напісаў нехта іншы. Такую работу адразу ж адхіляюць, здымаюць з дыстанцыі. У студэнта з'яўляюцца праблемы.

Як не дзіўна, але некаторыя студэнты нават не перачытваюць чужую работу.

— Выклікаю. Пытаюся, пра што ідзе гаворка ў гэтым параграфе? Чую ў адказ: «Там жа ўсё напісана». Тут увесь падман і выплывае наверх.

У некаторых работах, часцей за ўсё гэта адносіцца да рэфератаў (дастае з шафы некалькі студэнцкіх работ і дэманструе), маюцца нават спасылкі на інтэрнэтаўскія сайты.

Я ж, каб пазбегнуць падобных недарэчнасцяў, даю студэнтам эксклюзіўны на сёння план работы. Напрыклад, прашу раскрыць тэму сутнасці пакарання ў прынцыпова новым аспекце. Лічу, што адным толькі планам можна паставіць крыж на заказных дыпломах і курсавых... Акрамя гэтага, прыношу на заняткі артыкулы і манаграфіі замежных аўтараў. Знайсці іх у Беларусі немагчыма...

Студэнты, якія на другім курсе прыходзяць да Андрэя Віктаравіча пісаць курсавыя работы, як правіла, напрыканцы пятага курса маюць гатовыя навуковыя даследаванні. Многія з гэтых работ ідуць на рэспубліканскі конкурс, займаюць там прызавыя месцы.

— Барацьба з плагіятам на самым першым этапе. Вось мой прынцып працы.

Стараюся даць студэнтам адчуць сябе аўтарам, ганарыцца гэтым. Зрабіць так, каб яны не баяліся будаваць свае сказы, прыводзячы пры гэтым уласныя аргументы. А калі што не атрымліваецца, дапамагаю, даю параду.

«Якасна і прафесійна!» — гэта піяр. Напрыклад, у галіне крымінальнага права толькі каля двух дзесяткаў кандыдатаў і адзін доктар навук. Гэта — вузкапрафесійная сфера.



*Цішэй! Ідзе кансультацыя...*

— Сваё кола мы ведаем. Нават па стылю напісання работ няцяжка пазнаць калегу. Ды і не будзе ніхто вока запарушваць свайму паплечніку. Гэта ж прафесійная этыка.

Як паказвае практыка, асноўную масу заказных работ выконваюць учарашнія ці сённяшнія завочнікі. Гэта заўважна. Тут маецца небяспека: няякаснае выкананне. Часта ў такіх работах не ўлічаны вызначаныя патрабаванні ўніверсітэта: шрыфт, афармленне спасылак, тытульнага ліста, спіса літаратуры...

### ДЫПЛОМ — СВАІМІ СІЛАМІ?..

У Андрэя Віктаравіча ў гэтым годзе тры дыпломніцы. Шанцуе, калі трапляюцца старанныя і адказныя.

— Але ёсць выпускнікі, якія дацягваюць да апошняга, прыходзяць напярэдадні абароны. За два дні выкладчык, магчыма, і паспее ўнесці праўкі, але ці паспее студэнт іх улічыць... А калі яшчэ ў апошні момант высвятліцца, што дыплом «ліпавы»...

Раптам, як па заказу, прыйшла студэнтка-завочніца на кансультацыю па напісанню дыпломнай работы.

— Трэба раздзяляць такія паняцці, як студэнты дзённага аддзялення і завочнікі, — падтрымала размову Святлана. — Чым звычайным студэнтам займацца, акрамя вучобы? А ў завочнікаў — праца, сям'я, дзіця... Часам нават фізічна не паспяваеш выканаць кантрольную самастойна. Прыблізна восемдзесят працэнтаў маіх знаёмых завочнікаў заказваюць кантрольныя, радзей курсавыя работы. Але дыплом, перакананa, кожны будучы спецыяліст, калі ён сябе паважае, павінен напісаць сваімі сіламі.

А вось што думаюць наконт гэтага самі студэнты дзённага аддзялення:

«У студэнтаў не так шмат грошай, каб траціць іх на курсавыя і дыпломныя работы. А ляноту можна пераадолець...».

«Да такіх студэнтаў адношуся адмоўна, навошта тады яны прыйшлі ў ВНУ».

«Курсавая — не паказчык інтэлекту і прафесійных здольнасцяў, напрыклад, на журфаку БДУ ці Акадэміі мастацтваў. Калі ў цябе ёсць талент, ён, паверце, нікуды не знікне. Курсавая — пустая трата часу, таму, каб яго зэканоміць, можна і заказаць яе праз Інтэрнэт».

«У мяне часта не хапае часу, бо я, акрамя вучобы, сур'ёзна займаюся спортам і падпрацоўваю прамоўтэрам. Таму часам карыстаюся паслугамі студэнтаў-завочнікаў».

Сапраўды, праблема заказу курсавых і іншых работ — справа кожнай ВНУ, у прыватнасці. Безумоўна, калі працаваць толькі дзеля гадзін, то выкладчык будзе садзейнічаць развіццю ценявога бізнэсу, камерцыйнай дзейнасці такога плана. А калі ёсць попыт, то, адпаведна, будуць і прапановы, і наадварот...

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота аўтара.**

## Піктарыяльная фатаграфія

**Да 3 сакавіка ў галерэі «Дом фота» ў Мінску праходзіць выстава работ беларускага фатографа Сяргея Качэргіна «Піктарыяльная фатаграфія».**

Сяргей Качэргін — член фотаклубаў «Крыніца» і «Мінск», грамадскага аб'яднання «Фотамастацтва», адзін з нямногіх сучасных фатографаў-паслядоўнікаў такога віду фатаграфіі, як піктарыяльная.

Піктарыяльная фатаграфія ўзнікла ў сярэдзіне XIX стагоддзя. У перакладзе з латыні «піктус» — карціна, якая намалявана фарбамі, а англічанін Рабертсон першы выкарыстаў гэтае слова ў адносінах да фатаграфіі, пабудаванай па ўсіх жывапісных канонах.

Піктарыялісты сваімі працамі хацелі ператварыць фатаграфію калі не ў цэлую карціну, то хоць бы ў малюнак.

Так і ў дваццаці прадстаўленых на выставе працах Качэргіна ўсё быццам намалявана пэндзлем на фотапаперы, пранікае адно ў адно, жыве... Тут — шматграннасць прыроды і існуючага свету. Пейзажы і нацюрморты. Прыходзьце — і вы зможаце ацаніць фотапрацы самі.

**Марына ДЗМІТРЫЕВА.**

Абітурыент—2007

# «МАБІЛЬНЫЯ» АДЗНАКІ

**Як і абяцалі арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання, пачынаючы з гэтага года, усе ўладальнікі мабільных тэлефонаў змогуць даведацца аб выніках здачы цэнтралізаванага тэсціравання не толькі на сайтах Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў і вышэйшых навучальных устаноў, дзе яны праводзілі тэст-выпрабаванні, але і з дапамогай аператараў мабільнай сувязі. Больш таго, такая ж магчымасць прадастаўлена таксама ўдзельнікам другога і трэцяга раундаў рэпетыцыйнага тэсціравання. Другі раунд зараз — у самым разгары, а трэці пройдзе ў красавіку.**

Паслуга будзе рэалізаваная ў выглядзе інтэрактыўнага сэрвісу SMS-падпіска і на дадзены момант даступная для абанентаў VELCOM, МТС і DIALLOG.

Маладым людзям, якіх зацікавіць гэта прапанова, трэба або напярэдадні, або пасля праходжання тэсціравання адправіць **SMS-запыт на кароткі нумар 5050.** Аператыўна, па меры апрацоўкі бланкаў адказаў, мабільныя апаратары будуць адпраўляць сваім «падпісчыкам» SMS-паведамленні з інфармацыяй аб атрыманых на тэсціраванні балах.

Падпіска ажыццяўляецца асобна на кожны з этапаў рэпетыцыйнага тэсціравання і асобна — на атрыманне вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання.

***Фармат SMS-запыту:***

Нумар этапу тэсціравання / Серыя дакумента / Нумар дакумента (уся інфармацыя SMS-запыту ўводзіцца праз прабел):

***Нумар этапу тэсціравання:***

2 — другі этап рэпетыцыйнага тэсціравання

3 — трэці этап рэпетыцыйнага тэсціравання

4 — цэнтралізаванае тэсціраванне (у т.л. рэзервовы дзень)

***Серыя дакумента:***

серыю дакумента, указаную у бланку адказаў, трэба ўводзіць без прабелаў, вялікімі лацінскімі літарамі. Для беларускіх пашпартоў, напрыклад, MP, BM, AB і г.д. Для пашпартоў грамадзян Расійскай Федэрацыі — гэта першыя чатыры лічбы, надрукаваныя ўверсе кожнай старонкі пашпарта. Для пашпартоў іншых дзяржаў усе нялічбавыя сімвалы трэба ўносіць таксама, як указана ў дакуменце.

***Нумар дакумента:***

нумар дакумента, указанага ў бланку адказаў, трэба ўводзіць без прабелаў. Нулі, якія стаяць першымі, трэба ўводзіць абавязкова. Для беларускіх пашпартоў — гэта сямізначны нумар. Для пашпартоў грамадзян Расійскай Федэрацыі — гэта апошнія шэсць лічбаў, надрукаваныя ўверсе кожнай старонкі пашпарта.

Прыклад SMS-запыту на атрыманне вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання на пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь **серыі MP і № 0123456: 4 MP 0123456**

Прыклад SMS-запыту на атрыманне вынікаў трэцяга этапу рэпетыцыйнага тэсціравання на пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь **серыі BM 1234567: 3 BM 1234567**

Прыклад SMS-запыту на атрыманне вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання на пашпарт грамадзяніна Расійскай Федэрацыі **серыі 5101 і № 112233: 4 5101 112233**

У тым выпадку, калі пры фарміраванні SMS-запыту ці пры запаўненні рэгістрацыйнай часткі бланка адказаў будзе дапушчана памылка, вынік тэсціравання ў выглядзе SMS-паведамлення атрымаць будзе немагчыма. Аднак кошт адпраўленага SMS-паведамлення будзе спісвацца з рахунка ўладальніка мабільнага тэлефона. **Кошт адпраўкі SMS-запытаў на нумар 5050 складае 2500 рублёў без уліку падатку.**

У SMS-паведамленні апаратара мабільнай сувязі, якое атрымае абітурыент, будзе ўтрымлівацца наступная інфармацыя: серыя дакумента, нумар дакумента, від тэсціравання, нумар этапу тэсціравання, назва вучэбнай дысцыпліны і тэставы бал.

Прыклад такога паведамлення:
MP 012345
СТ, Этап 4
Беларуская мова
Бал: 85.

***Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці на сайце www.333.by.***

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# МІЖНАРОДНЫ СТУДЭНЦКІ — ДЛЯ ЎСІХ

**Вырашыла я адпачыць гэтай зімой дзе-небудзь за мяжой. Выбрала краіну, занесла дакументы на афармленне візы і пачала чакаць. Сябры, дазнаўшыся пра маю вандроўку, параілі: «А зрабі сабе картку ISIC!» «Што гэта? І навошта мне?» — здзівілася я. «Не пашкадуеш!» — падміргнулі яны, а я накіравалася ў самую буйную кампанію, якая займаецца выдачай такіх картак.**



**«ЗАГАДКАВЫЯ» КАРТКІ**

У кампаніі «Стар Травел» пра «загадкавыя» карткі мне давялося паразмаўляць з дырэктарам фірмы Кацярынай Рыбаковай.

— ISIC — вельмі патрэбная рэч, — расказвае Кацярына. Гэта і міжнародны студэнцкі білет, які індыфікуе вашу асобу, і дысконтная картка, пры дапамозе якой можна карыстацца скідкамі на тавары і паслугі ад 5 да 100 працэнтаў не толькі за мяжой, але і ў Беларусі. Сама картка была заснавана ў далёкім 1968 годзе, калі з'явілася адна са структур Міжнароднай канфедэрацыі студэнцкага турызму — Асацыяцыя міжнароднага студэнцкага пасведчання — ISIC. І ўсё гэта праводзілася па ініцыятыве ЮНЕСКО. За ўвесь гэты час больш за 40 мільёнаў студэнтаў з усяго свету сталі карыстальнікамі картак. Кожны год да іх далучаюцца яшчэ больш за 4 мільёны студэнтаў з розных краін, каля 30 тысяч з якіх — студэнты з Беларусі!

Дарэчы, такую картку можа атрымаць не толькі студэнт. Усяго існуюць тры тыпы. Першы — ISIC (International Student Identity Card), які могуць аформіць студэнты і аспіранты дзённых аддзяленняў навучальных устаноў, навучэнцы агульнаадукацыйных школ, каледжаў, ліцэяў і гімназій ва ўзросце ад 12 гадоў. Картку IYTC (International Youth Travel Card) атрымлівае моладзь ва ўзросце да 26 гадоў, а ITIC (International Teacher Identity Card) — выкладчыкі.

**БЯСПЛАТНАЯ ЛІНІЯ І ЭЛЕКТРОННАЯ ПОШТА**

— Вось збіраюся я за мяжу, — дапытваюся ў Кацярыны, — а навошта мне там картка?

— Акрамя пералічаных магчымасцяў карткі ёсць і яшчэ вельмі цікавыя і карысныя рэчы, — усміхаецца Кацярына. — Напрыклад, за мяжой вам спатрэбілася тэрміновая юрыдычная або медыцынская парада. І што ж застаецца рабіць? Тэлефанаваць на бясплатную лінію Help Line (+44) 20 8762 8110, якая працуе нават ноччу. Там, дарэчы, вам будуць даваць кансультацыю на роднай мове! Таксама картка дае магчымасць бясплатна карыстацца электроннай і галасавой поштай, а льготы на міжнародныя тэлефонныя размовы да 70 працэнтаў!

— А калі картка не будзе працаваць у той краіне, куды я паеду? — схамянулася я.

— Абавязкова будзе! — запэўнівае мяне Кацярына. — Картка працуе фактычна па ўсяму свету. А для таго, каб даведацца пра скідкі у той краіне, якую вы плануеце наведаць, трэба зайсці на сайт www.isic.by або www.isic.org. А ўсю інфармацыю можна паглядзець на сайце www.startravel.by.

— А цяжкасці? — не супакойваюся я.

— За мяжой можа ўзнікнуць толькі адна цяжкасць, — смяецца Кацярына, — Калі ваш сябар атрымае скідку па картцы, а вы — не. І ўсё таму, што ў вас проста няма ISIC!

**ПЯЦЬ ХВІЛІН ЧАКАННЯ**

— А як справы ў Беларусі? Вы казалі, што і тут можна атрымаць скідкі?

— Гэта так, — упэўнівае мяне Кацярына. — Але існуе шмат праблем. Картка не вельмі папулярная сярод нашай моладзі, але мы робім усё магчымае, каб студэнту жылося лягчэй. І танней! Харчаванне, адпачынак, забавы, вандроўкі, сэрвісныя паслугі... У Мінску пра картку ўжо ведаюць, а вось у абласных цэнтрах, на жаль, значна менш. Таму мы праводзім розныя мерапрыемствы, спецыяльныя прома-акцыі, робім рассылкі для пошуку новых партнёраў. Днямі збіраемся ў Брэст. Спадзяёмся, што і ў раённых цэнтрах можна будзе хутка карыстацца карткамі.

Перспектывы мяне ўзрадавалі, і я ўсё ж такі вырашыла зрабіць сабе ISIC. «Складаная гэта працэдура!» — мільгала ў галаве.

— З вас студэнцкі білет, пашпарт, каляровая картка, 9 тысяч рублёў і пяць хвілін чакання! — нібы прачытаўшы мае думкі, усміхаецца супрацоўніца кампаніі.

— Так хутка? — здзіўляюся я.

— У студэнтаў ніколі не бывае вольнай хвіліны! Мы гэта разумеем.

**ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА**

Мне давялося цудоўна адпачыць. Ды і картка ў гэтым сэнсе таксама вельмі дапамагла. Па скідках я харчавалася, купляла падарункі бацькам і сябрам, а самае галоўнае, наведала ў два разы больш музеяў. У той час, калі мае знаёмыя студэнты не маючы «чароўнай» карткі плацілі за поўны білет, з маіх кішэняў сыходзіла грошай напалову менш. Ды і ў Мінску карткай я працягваю карыстацца. Напрыклад, у грамадскім транспарце, калі просяць паказаць студэнцкі білет. Часцей вераць. А на наступным тыдні ў модны буцік пайду. Там для мяне ўжо дзейнічае шмат спакуслівых скідак.

**Марына БЕГУНКОВА.**
**Фота аўтара.**

***НА ФОТА: Кацярына РЫБАКОВА: «Афармляйся — і да скідак далучайся!».***

Равеснікі

# КРУПЧАНІН...

**Што чулі вы, паважаныя чытачы, пра горад Крупкі? Напэўна, не вельмі многа. Шчыра кажучы, я сама была здзіўлена, калі, гутарачы са сваімі сябрамі, чула іх адказы на гэтае пытанне: «Гэта горад?» — здзіўляліся адны. «А ці далёка ён ад сталіцы?» — пыталіся другія. «Ці ходзяць туды электрычкі?» — цікавіліся трэція... Мабыць, і ў вас зараз з'явілася, прынамсі, адно пытанне: з-за чаго такая цікавасць да гэтага населенага пункта, невялікага райцэнтра ў Мінскай вобласці? Проста я хачу расказаць вам пра аднаго вельмі цікавага чалавека, 16-гадовага крупчаніна з незвычайным для гэтых мясцін прозвішчам. Завуць яго Ерванд Саргсян. Сям'я Ерванда прыехала ў Беларусь пяць гадоў таму з Арменіі (жылі Саргсяны да прыезду да нас у горадзе Абавян, што недалёка ад сталіцы гэтай каўказскай рэспублікі). А зараз усе Крупкі ведаюць Ерванда як незвычайнага парадыста, кажуць, што няма на нашай эстрадзе зоркі, якую б гэты малады талент не змог бы «скапіраваць».**



— Першы раз я выступіў, калі можна так сказаць, з пародыяй яшчэ дома, на нейкім сямейным свяце, тады мне было толькі шэсць гадоў, — расказвае Ерванд. — І вось гэта заўважыла мая мама. Яна і паспрабавала развіць гэтую маю здольнасць. І ўжо ў школе я няблага парадзіраваў... настаўнікаў, далей — болей...

— І сапраўды, назіраючы за выступленнем Ерванда на сцэне, не пакідае ўражанне, што бачыш не школьніка, а маладога... Чарлі Чапліна, такое здзіўляючае падабенства ў знешнасці. Ну а што датычыцца сённяшніх зорак, то і Сасо Паўліашвілі, і Ала Пугачова, і Рэгіна Дубавіцкая, думаю, смела пазналі б сябе ў новым вобразе, яны асабліва бліскуча ўдаюцца хлопцу. Глядзіце, якія ўзнагароды ён ужо мае: Дыплом за лепшы канферанс у першым абласным конкурсе тэатральных калектываў і вядучых, які адбыўся летась, Падзяка старшыні райвыканкама за першае месца ў абласным конкурсе тэатральных калектываў і вядучых «Тэатральны вернісаж» — таксама ў 2006 годзе (дарэчы, вельмі цёпла пра Ерванда тады сказала народная артыстка Беларусі Марыя Захаравіч)... Іх вельмі многа — розных падзяк, грамат, дыпломаў. Спадзяёмся, што галоўныя ўзнагароды яго ўсё ж наперадзе!

А яшчэ Ерванд вельмі прыгожа іграе на саксафоне: акрамя звычайнай, ён вучыцца ў музычнай школе, чацвёрты год займаецца гэтым музычным інструментам. І са спортам Ерванд сябруе. Праўда, якому-небудзь аднаму віду асаблівай увагі не надае. Але здаровы лад жыцця, як ён лічыць, — сёння вельмі важная справа.

— Значыць, Ерванд, у цябе наогул няма вольнага часу — школа, музыка, пароды. А хто дапамагае табе «раскручваць» твой талент?

— Маім мастацкім кіраўніком з'яўляецца Ганна Аляксееўна Кукарцава, з ёю мы займаемся пастаноўкай будучых канцэртных нумароў. Акрамя таго Ганна Аляксееўна год таму стала маёй хроснай мамай.

— А што цябе цікавіць акрамя музыкі і сцэны?

— Юрскі перыяд! Так здарылася, што я захапіўся ўсім, што адносіцца да таго гістарычнага перыяду, — жывёлы, якія насялялі нашу планету, расліны. Чытаю пра гэта ўсё, што знаходжу ў літаратуры, Інтэрнэце. Акрамя гэтага, заўважыў, што ўва мне «прачнуўся» неблагі кулінар. Мая бабуля Арусяк Рыгораўна захапіла мяне кулінарыяй — так, як яна ўмее гатаваць шашлык, не ўмее, мабыць, ніхто. І наогул, я лічу, што толькі стравы з мяса могуць прэтэндаваць на першыя ролі ў розных кулінарных ток-шоу на тэлебачанні.

— Што ж, ты гаворыш як сапраўдны каўказскі мужчына! А як табе жывецца ў Беларусі? Падабаецца?

— Вельмі падабаецца. Раней, у сябе на радзіме, я мала што ведаў пра Беларусь. І як прыемна зараз усведамляць, што беларусы — такі добры і гасцінны народ.

— Якія ж у цябе планы на будучае? Куды збіраешся паступаць?

— Хачу вучыцца на тэатральным факультэце ў Акадэміі мастацтваў. Не паступлю з першага разу — буду спрабаваць зноў і зноў...

**Крысціна ЛАНЕЦ,**
**падрыхтоўчае аддзяленне факультэта БДУ.**

Аляксей КАЛЮЖНЫ:

# «ФРЭЙЗЕР СКАЗАЎ, ШТО НЕ ДАЗВАНІЎСЯ»

**Калюжны ў Суперлізе «на кані»: забівае і забівае... Здаецца, што яго рэкордам няма канца. Наперадзе яго толькі Аляксей Марозаў з казанскага Ак Барса, наш жа Аляксей — на другім радку бамбардзірскага спісу. Так, у клубе, відаць, усё складваецца як нельга лепш, але вось пытанне аб зборнай застаецца адкрытым. Два гады таму, калі зборную Беларусі ўзначаліў Глен Хэнлан, уся хакейная грамадскасць была ў шоку: Калюжнага няма ў заяўленых спісах на чэмпіянат свету ў Аўстрыю. Матывіроўка тады была простай: псуе мікраклімат у камандзе. Нічога страшнага, падумаў тады Калюжны, упакаваў чамаданы і паехаў з сям'ёй адпачываць. Але вось і на леташні чэмпіянат свету ў Рыгу ён таксама не быў заяўлены, а гэта ўжо сур'ёзны рэзананс — па ўсіх паказчыках лепшы ігрок застаецца за бортам галоўнай каманды краіны. Але матывіроўкі ўжо няма, толькі апраўданні Хэнлана, што ён даверыўся чужой думцы.**

**У гэтым сезоне зборную Беларусі на чэмпіянаце свету будзе трэніраваць аднадумец і паплечнік Хэнлана — Курт Фрэйзер. І што за сюрпрыз гэтым разам? Тут пакуль паставім кропку.**

**Да бар'ера, так сказаць! Толькі цяпер выкажацца аб набалелым сам Калюжны.**



— Я дзесяць гадоў гуляў за зборную і ні разу не сказаў «не магу», спаслаўшыся на якую-небудзь траўму. Я заслужыў, па крайняй меры, таго, каб мне сказалі: хлопец, дзякуй, але далей мы ідзём з другімі. Калі гэта адбываецца так, як было два гады таму, лічу, што гэта плявок у душу не толькі мне, але і маім балельшчыкам. Яны ў чым вінаватыя? Калі хто-небудзь здольны вырашаць за іншых, то ён павінен несці адказнасць за прынятае рашэнне. А праляцеў міма Вены, мяне не ўзялі на чэмпіянат свету ў Рыгу, не было ніводнага званка ні ад каго, акрамя тых, хто выказаў падтрымку. Пасля чэмпіянату свету ў Латвіі мне тэлефануе Хэнлан і гаворыць: «Я не меў рацыі, калі не ўзяў цябе на чэмпіянат свету, але гэта было меркаванне іншых людзей». Як можна працаваць з галоўным трэнерам, які самастойна не вызначае састаў? Ён жа галоўны? Калі б ён патэлефанаваў і сказаў: так, Аляксей, я не ўзяў цябе на чэмпіянат свету, таму што ёсць людзі, якія справяцца з гэтай задачай лепш, чым ты, то гэта было б, па крайняй меры, сумленна. І тады ніякіх пытанняў! Я ўжо спакойны і адношуся да ўсяго па-філасофску. Слухаў у трубку, як маленькае дзіця спрабавалі чымсьці супакоіць: на, маўляў, вазьмі цукерку, усё нармальна. Калі ў камандзе кожны сам за сябе, то яна асуджана. Гэта не выйсце — сёння ўзяць сваё, а там — трава не расці.

***— Галоўны трэнер зборнай Беларусі Курт Фрэйзер вамі цікавіўся?***

— Дзесьці я нядаўна прачытаў яго інтэрв'ю, дзе ён гаворыць, што да мяне не дазваніўся.

***— Моцна, значыць, хацеў?***

— Гэта ўжо не мне вырашаць.

***— Ёсць ахвота прыехаць згуляць за зборную на чэмпіянаце свету?***

— Ахвота ёсць, але ёсць яшчэ і абставіны. Я жыву сённяшнім днём. Сёння ў мяне матч, я аб ім думаю — наперад не заглядваю. Так прасцей і менш расчараванняў, скажам так.

***— Даўні канфлікт да гэтага часу разрывае душу?***

— Я не скажу, што менавіта канфлікт з'яўляецца для мяне вызначальным. Было і было. Цяпер усё роўна многае змянілася, трэнер іншы. Усё будзе залежаць ад адносінаў. Цяжка мне пакуль на гэту тэму разважаць.

***— Калі выклік паступіць, паедзеце?***

— Ці буду я сам упэўнены, што прынясу карысць гэтай камандзе? Мне трэба адчуваць найперш давер. Пакуль я яго не адчуваю.

***— Як вы можаце адчуваць давер трэнера, які толькі-толькі стаў ля руля?***

— Міхаіл Захараў ужо даўно не трэнер зборнай, аднак кожны тыдзень тэлефануе. Дробязі, так? Гэта дазваляе лепш ведаць чалавека і разумець яго. Мне хлопцы з «Лады», што гуляюць за зборную, расказвалі, што, калі яны гулялі ў Маскве, трэнеры зборнай прыязджалі глядзець на легіянераў. Відаць, прыехаць на маю гульню ў іх не было магчымасці. Сама сітуацыя такая, што з кімсьці кантактуюць, з кімсьці — не. Відаць, яны адказваюць за вынік і вырашаюць, хто ім патрэбны, а хто не.

***— Добра, пакінем зборную. Надоўга ў Омску? Засталіся б у Сібіры да канца кар'еры?***

— З задавальненнем. Калі знойдзеш сваё месца і адчуваеш, што яно сапраўды тваё, то навошта мяняць? Мне добра, камфортна. Я адчуваю сябе ў сваёй камандзе.

***— Напрыканцы кар'еры, калі паступіць прапанова з мінскага «Юнацтва», адклікніцеся?***

— Да Захарава? Паеду! «Юнацтва» — мая каманда. Я вырас там. І гэта галоўная прыступка. Усе родныя твары, добрая абстаноўка і дружны калектыў. Я там дома. Свой.

***— Бацькам дапамагаеце?***

— Для мяне сям'я — гэта ўсё, дзеля чаго, уласна, хакеем займаўся і працягваю займацца. Самае прыемнае, што ты можаш купіць бацьку добрую машыну. Унутры радасць, шчасце і гонар, што бацька на цябе глядзіць з гонарам. Важны не сам падарунак, а тое, што ён убачыў сына тым, кім ён хацеў яго бачыць.

***— Вось, кажуць, Ганна Курнікава за дом судзіцца са сваёй маці...***

— Нават уявіць такога не магу. Мае бацькі ніколі ні на што не прэтэндавалі, ніколі ні аб чым не прасілі. І калі я што-небудзь для іх рабіў, гэта было маё жаданне. Бацька — інжынер, мама доўгі час працавала намеснікам дырэктара мясакамбіната. Людзі сталі прафесіяналамі, чагосьці самі ў жыцці дасягнулі. Мама прыйшла на камбінат простым майстрам, у яе 27 гадоў бесперапыннага стажу. А калі даведваешся, якую зарплату яна атрымлівае, дыбам валасы становяцца. Людзі, якія ўсё жыццё адпрацавалі, на маю думку, павінны нармальна атрымліваць, і адносіны да іх павінны быць зусім іншыя.

***— А тым, хто забівае шайбы, больш плацяць?***

— Я не заглядваю сваім аднаклубнікам у кашалькі. Я ведаю свой кантракт — і ўсё.

***— Каманда ў лідарах, не ў лідарах — сумы адрозніваюцца?***

— У цябе ёсць кантракт, і калі сезон ты адгуляеш пасрэдна — у наступным кантракт урэжуць.

***— Жыць пасля завяршэння кар'еры дзе будзеце?***

— Мы ўжо абмяркоўвалі з жонкай. Мае бацькі жывуць у Мінску, у нас кватэра ў Маскве — трохпакаёвая, у яе бацька жыве ў Грэцыі. Вырашылі, што будзем жыць там, дзе будзе цікавая работа.

***— Стаміліся ад Мінска?***

— Я не стаміўся. Мне проста не хапае там жыцця. У Мінску спакойна, усё добра. У бацькоў гадзіну пабуду ў гасцях, у сястры — хвілін пятнаццаць, з'езджу ў цэнтр, пабачуся з сябрамі... І ўсё. Мне ў Маскве прыяцель тэлефануе: давай убачымся! Давай! Але на гэта пойдзе цэлы дзень. Пакуль я да яго даеду, пакуль мы сустрэнемся, пакуль у «пробцы» пастаю...

***— Расійскі пашпарт дае якую-небудзь прывілею? Беларускага, як разумею, ужо няма?***

— Беларускага ўжо няма.

***— Рэгістрацыю не правяраюць у Мінску?***

— *(Смяецца).* У Маскве правяралі.

***— Знешнасць каўказская, ці што?***

— *(Усміхаецца).* Мая жонка выкупляла мяне з міліцыі. Мы з ёй толькі пачыналі сустракацца, запрасіў яе ў начны клуб. Раніцай на таксі па дамах. З намі раўняецца міліцэйская машына, і сяржант міліцыі заглядвае ў акенца: ага, хлопец едзе з дзяўчынай...

***— ...Падумаў — нядобра. Трэба было б дзяўчыну ў хлопца ўкрасці?***

— *(Смяецца).* Мігалкі ўключылі — стоп кран! А ў мяне з дакументаў — беларускі пашпарт. Я нават быццам за ім палез, але міліцыянер заспакоіў: «Вы, малады чалавек, можаце не паказваць, а вось дзяўчына... Дастае пашпарт з двухгаловым арлом і маскоўскай прапіскай. Ён: «Ну, раз такая справа, то давайце і вы свой пашпарт!», (беларускі пашпарт і мінус рэгістрацыя). А-а, ну ўсё, паехалі! Нам з таксістам загадалі ехаць за іх газікам. Пасадзілі мяне за краты (*смяецца*). Жонка жартуе: калі ты будзеш старэнькі, з палачкай, я табе скажу, у колькі ты мне, ясны сокал, абышоўся. Цьфу-цьфу, абышлося без прыгод.

***— Вашы адносіны да газавага канфлікту паміж дзвюма краінамі — Расіяй і Беларуссю?***

— *(Смяецца.)* Я ніяк з газам не звязаны.

***— Спонсар у «Авангарда» — «Газпрам»?***

— Мы, спартсмены, усё роўна на гэта глядзім збоку. Памятаю, паехаў гуляць за зборную яшчэ СНД, на майках у нас — ніякіх спонсараў, толькі надпісы «Беларусь» — асобна.

***— Вы дзе сябе адчуваеце дома?***

— Цяпер мой дом у Маскве. Я вельмі доўга прывыкаў да гэтага горада, складана было. Мне здавалася, нейкі вар'яцкі дом, дзе ва ўсіх свая місія (*смяецца*). Людзі кудысьці пастаянна накіраваны, не спыняюцца нават. Да таго ж у Маскве кожны сам за сябе, караскаецца на вяршыню нягледзячы ні на што. Пераступяць і асабліва не задумаюцца. Калі пасля Масквы прыязджаеш у родны Мінск, то адчуванне, што трапіў у курортны горад — працэнтаў восемдзесят мінчан адпачываюць. Беларусы нікуды не спяшаюцца (калі наогул спяшаюцца), нікуды ім не трэба (калі наогул трэба) — зусім іншы тэмп жыцця. Чым глыбей прырастаеш да Масквы, тым мацней яна трымае. Тут не ўсё проста, але заўсёды цікава.

***— Вам даводзілася прыстасоўвацца да людзей з іншым узроўнем мыслення? Тут такая палітыка: няма грошай — ты не чалавек! Называецца, дапамажы сабе сам.***

— Першы час, канешне, табе ніхто не дапаможа, хоць і ёсць такія, але на ўсё патрэбны час.

***— Таму што ёсць грошы?***

— Калі ў цябе з'яўляюцца грошы, яны ўсё роўна надаюць нейкую ўпэўненасць. І нават не нейкую, а вельмі моцную ўпэўненасць. Ва ўсім даводзілася адмаўляць. Памятаю, мне было чатырнаццаць. Мы на Новы год прыехалі ў Швецыю. Жылі ў спартзалах. Людзі рэчы прыносілі бауламі, падарункі дарылі. Мы адтуль іх везлі ў Маскву. На метро нават часам не было грошай, даводзілася прарывацца. Было вельмі цяжка. Але мне пашанцавала. Я і жонку сустрэў, калі ў кішэнях нічога не было. Далі зарплату, а праз дваццаць дзён у кагосьці пазычыў да наступнай. Калі б я зараз не быў жанаты, напэўна, вельмі цяжка было б. Доўга б прыглядаўся да людзей.

***— Валерый Канстанцінавіч Белавусаў, ваш клубны трэнер, што пажадаў вам у год Свінні?***

— Што ён нам можа пажадаць? *(Смяецца.)* Каб нам свінню не падкалалі і гальштук не дарылі яму на дзень нараджэння.

***— У вас дні нараджэння святкуюць?***

— Толькі на лёдзе. На раскатцы імянінніка падкінем пару разоў. У каго дзень нараджэння, той прыносіць торт.

***— Куды ў асноўным ходзяць хакеісты ў Омску?***

— У Омску нельга згубіцца, там мала месцаў, куды можна пайсці. Цяпер вось новы кінатэатр «Галактыка» адкрыўся.

***— Фільмы любіце?***

— Дзе тут палюбіш, калі ў цябе трохгадзінныя пералёты два разы ў тыдзень?! У Маскву і назад. Апошні фільм, які паглядзеў, — «Крывавы алмаз». Складаны фільм. Мне спадабаўся. Там пра здабычу алмазаў у Афрыцы, пра тое, як выкарыстоўваць дзіцячую працу і як на гэтым людзі робяць грошы. Алмазы ў цывілізаваным свеце бліскаюць — і ўсё прыгожа. Іх дораць, а як яны здабываюцца, праз якія цяжкасці, якія з-за гэтага адбываюцца войны...

***— Хакеісты — тыя ж алмазы: пакуль не выгравіруеш, не заблішчаць?***

— Так і ёсць. Я, напрыклад, у 13 гадоў воляй-няволяй стаў самастойным. Спачатку гэта самастойнасць радуе, ап'яняе, што вось, нарэшце, я вырваўся з дому. Усё давалася толькі праз працу і ўпартасць. Былі вельмі цяжкія моманты. Ва ўсякім разе можна было б застацца ні з чым. Але сёння я маю ўсё.

**Вольга РАМАНЮК.**

## Муз-news

### ФРЭДЭРЫК ПАГАЛІЎСЯ... У ЗНАК ПРАТЭСТУ

**Саліст гурта «The Project» Фрэдэрык выбраў даволі эпатажны спосаб выказаць сваё меркаванне. Не пагадзіўшыся з вынікамі нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне», артыст пагаліўся налыса.**

Яшчэ задоўга да фіналу адбору Фрэд неасцярожна пажартаваў у кампаніі сяброў, маўляў, калі не пройдзем — пагалюся. Хто ж ведаў, што слова давядзецца стрымаць? ...Насамрэч, натуральна, жаданне змяніць прычоску ў абаяльнага мулата ўзнікла даўно, проста нагоды ўсё не знаходзілася. А тут — на лаўца і звер. За рэкордна кароткі час Фрэдэрык пазбавіўся фірменных «косак», што больш за ўсіх засмуціла дачок музыканта Ніколь і Алію. Зрэшты, зараз дзяўчаты прывыклі, а прыхільнікі пазнаюць паголенага Фрэда, бадай, яшчэ часцей, чым раней. У якасці маральнай кампенсацыі фанаты гурта стварылі адмысловы сайт www.pro-ject.by.ru, дзе зараз акумулююцца ўсе навіны з жыцця «The Project». А навін хутка прыбавіцца — на вясну запланаваны выхад дэбютнага сінгла і кліпа гурта.

### АНЯ ШАРКУНОВА НАБІЛА ГУЗАКІ



**Маладая спявачка нароўні з іншымі шасцю артыстамі эстрады і папулярнымі вядучымі ўзяла ўдзел у здымках рэаліці-шоу «Цудоўная сямёрка». Паводле правілаў праекта, за лічаныя дні трэба было навучыцца стаяць на горных лыжах і ў фінале прадэманстраваць найлепшы спуск з гары. Зразумела, здавацца не хацеў ніхто, але найбольшую эмацыянальнасць — ад слёз і спроб пакінуць праект да шчырага захаплення — прадэманстравала менавіта Аня.**

Як прызналася артыстка, на лыжы яна ўстала ўпершыню ў жыцці — і ўпала столькі разоў, што цяпер у яе гузакі па ўсім целе, на сцэну не хутка ўдасца выйсці ў спакуслівым касцюме. «Я зразумела адно: неабавязкова віртуозна катацца на лыжах, каб быць спявачкай. Мая работа мне больш па душы, і няхай сабе ў рэаліці-шоу я аказалася самым слабым звяном», — расставіла для сябе акцэнты Аня. Тым больш, «самай слабай» яна ўсё ж не аказалася, бо ўсіх выпрабаванняў не вытрымалі нават мужчыны — напрыклад, Тарыел Майсурадзе вымушаны быў з-за траўмы сысці з дыстанцыі.

### РУСЛАН АЛЯХНО НЕ ДАСЦЬ ЗАРАБІЦЬ ПІРАТАМ

**Музычнага матэрыялу ў спевака назбіралася ўжо на выпуск другога сольнага альбома, але Руслан не спяшаецца парадаваць прыхільнікаў чарговай пласцінкай — аддае перавагу канцэртным выступленням.**

«Ні я, ні мае прадзюсары не ставім мэтай выпусціць чарговы альбом. Бо сёння надта яскрава квітнее пірацтва, і артыст не зарабляе на сваёй музыцы. Навошта тады расчароўваць слухача дрэннай якасцю запісаў і дазволіць атрымаць грошы чужым дзядзькам?» — растлумачыў сваю пазіцыю Руслан. Зрэшты, пазней пагадзіўся, што другі альбом усё ж будзе — але канкрэтных тэрмінаў пакуль ніхто не плануе. Дый новыя хіты — «Жамчужына», «Бягучая па хвалях» — трэба яшчэ як след абкатаць на публіцы.

Паводле слоў артыста, зараз яго творчасць больш сур'ёзная і змястоўная, чым адразу пасля перамогі на «Народным артысце». «Гэта раней я марыў пра ўдзел у «Фабрыцы зорак», здаецца, трэцяй — нават сваю касету дасылаў. А зараз вырас і развіваюся ў іншым накірунку», — кажа спявак. У прыватнасці, у рамках «іншага накірунку» Руслан пачаў займацца ігрой на саксафоне — праўда, на сцэне з гэтым інструментам мы выканаўцу наўрад ці ўбачым, занятак ідуць, што называецца, «для душы».

### ДАРЫЯ ПРАБІВАЕЦЦА НА «СЛАВЯНСКІ БАЗАР-2007»



**Фіналістка тэлепраекта «Народны артыст-2» спявачка Дарыя (Дар'я Урызчанка) вельмі хоча трапіць на конкурс маладых выканаўцаў у Віцебску. Але, у адрозненне ад тых, хто толькі марыць і будуе гіпотэзы, Дарыя зрабіла паспяховыя крокі ў рэалізацыі гэтага жадання. На дадзены момант дзяўчына пераадолела другі адборачны тур Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў «Віцебск-2007».**

Беларусь, Расію і Украіну на конкурсе традыцыйна прадстаўляюць па два ўдзельнікі. На вакантныя месцы ад нашай краіны зараз засталося чатыры прэтэндэнты — акрамя Дарыі, гэта спявак Георгій Калдун (старэйшы брат удзельніка «Еўрабачання-2007» Дзмітрыя Калдуна), салістка Нацыянальнага канцэртнага аркестра Аніка (Ганна Толсцікава), а таксама саліст гурта «Стая» Канстанцін Дудараў (між іншым, вучань Пятра Елфімава).

Рашэнне журы, хто ж сёлета прадставіць Беларусь на фестывалі мастацтваў у Віцебску, будзе агучана толькі ў красавіку. Так што застаецца толькі перажываць за канкурсантаў і падтрымліваць — кожнаму свайго ўлюбёнца.

### МАНГА, КАТЫ І ЛЕКІ АД МЕЛАНХОЛІІ

**Праект «Лекі ад меланхоліі» выдаў другі па ліку альбом. Называецца ён «Ломцік манга», а на вокладцы чамусьці... кот. І героі новага відэа «Блюз бадзяжных катоў» — таксама не зусім (або зусім не) людзі. Але якасць музыкі ад гэтага не пагоршылася.**

Два гады музыканты адседжваліся ў студыі, а зараз усё ж вырашылі выйсці на канцэртныя пляцоўкі і даць дыхту — ці які там пазітыў атрымаецца. Прэзентацыя альбома запланавана на 1 сакавіка, і ў жывым канцэрце, акрамя «Л.А.М.», возьмуць удзел госці — «Madera Hard Blues» і магілёўскі «Дызель». Калі выступленне будзе ўдалым, музыканты абяцаюць рэгулярна ўдзельнічаць у вялікіх і малых фестывалях. Спецыяльна для радыё (без раскруткі сёння нікуды) плануецца зрабіць «палегчаны» альбом «прыпапсаваных» песень. «Не хацелася б усё фармаціраваць пад густы радыйнікаў. Мне, канешне, шкада будзе, калі нашы песні не будуць запатрабаваны на радыё, але кланяцца дзеля папулярнасці вельмі нізка таксама не хочацца», — падзяліўся Яўген Салдаценка.

Што да кацінай тэмы ў творчасці, то яна таксама атрымае развіццё. Беларускія мультыплікатары зробяць поўнаметражны мульцік пра гэткага антыпода ката Леапольда — хуліганістага, задзірлівага, — а музыканты забяспечаць саўнд-трэк.

### ПАДВОДНЫЯ ПЕСНІ ГЕРЫ

**Спявачка Gera прадставіла ў тэлеэфіры свой дэбютны кліп на песню «A River» («Рака»). Паводле прызнання самой артысткі, хоць дакладнага сюжэту ў роліку і няма, але затое гэта выключна ўдалае ўвасабленне яе ўласных пачуццяў і эмоцый.**



Большая частка відэа пабудавана на кантрастах: зімняя рака супраць пустыні, натурныя здымкі супраць камп'ютарнай графікі... А ў адным з фрагментаў спявачцы давялося нават пагрузіцца пад ваду. «Я захапляюся дайвінгам, але без патрэбнай амуніцыі ніколі не пагружалася. І ўсё ж рэжысёр пераканаў, што без падводных здымак — ніяк. Давялося не проста сядзець пад вадой, а яшчэ і спяваць на глыбіні», — расказала Гера.

**Вядучая рубрыкі**
**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

### «ЗАРНІЦА» ДЛЯ «ЦЯЖКІХ» ПАДЛЕТКАЎ

**У Віцебску адбылася ваенна-патрыятычная гульня «Зарніца» для цяжкіх падлеткаў! Яе ўдзельнікі пераадольвалі паласу перашкод, хадзілі і спявалі ў страі, правялі інтэлектуальны турнір «Па старонках Айчыны».**

Ваеннаслужачыя 103-й мабільнай брыгады паказалі «цяжкім» сваё майстэрства вядзення рукапашнага бою, азнаёмілі са зброяй. Сярод арганізатараў быў і гаркам БРСМ.

А ў Оршы з дапамогай БРСМ прайшла «Зарнічка» для школьнікаў. За перамогу змагаліся 25 каманд...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### Армейскае прывітанне

**Цікавую і карысную акцыю «Парадна-выхадное прывітанне» арганізуе 23 лютага гомельскае радыё «Экспрэс».**

У Дзень абаронцаў Айчыны з 11 да 14 гадзін ды-джэі Таццяна Ушакова і Дзмітрый Дзянісаў прадставяць слухачам ваенна-палявую пошту: юнакі, якіх прызвалі на тэрміновую ваенную службу ў Мінск з Гомельскай вобласці, перададуць свае прывітанні родным і сябрам. Дзеля гэтага вядучыя спецыяльна наведалі ў сталіцы вайсковыя часці, дзе пазнаёміліся з умовамі службы салдат.

**Ірына ПРЫМАК.**

# Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мінск Крышталь»: ВЕКАВЫЯ ТРАДЫЦЫІ ЯКАСЦІ, ПРАВЕРАНЫЯ ЧАСАМ

## Флагману ў сваёй галіне Мінскаму ВГЗ «Крышталь» — 114 гадоў

*Кропка адліку Мінскага вінна-гарэлачнага завода «Крышталь» — 1893 год, калі браты-прамыслоўцы Ракоўшчыкі заснавалі дрожджава-вінакурны завод на Ніжне-Ляхаўскай (цяпер Кастрычніцкая) вуліцы, дзе і па сёння захаваліся карпусы завода-першынца, разгарнулася новая сучасная вытворчасць. Зерневы спірт братоў Ракоўшчыкаў з'яўляўся ўзорам выканання высокіх дзяржаўных стандартаў. Вырабы Ракоўшчыкаў годна ацэньваліся на шматлікіх выставах. Аб гэтым гаворыць залаты медаль на выстаўцы ў Парыжы ў 1905 годзе, галоўная прэмія на рымскай выстаўцы ў 1911 годзе, залаты медаль на растоўскай выстаўцы пастаўшчыкоў імператарскага палаца 1906 года.*

*Сёння Мінскі ВГЗ «Крышталь» — старэйшы і буйнейшы ў Беларусі вытворца папулярных напояў. За больш чым векавую гісторыю па праву заняў лідзіруючае становішча ў галіне, а прадукцыя маркі «Крышталь» заваявала папулярнасць не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і ў многіх краінах свету.*

*Фірменная прадукцыя завода валодае сапраўдным нацыянальным каларытам і добрым смакам дзякуючы пастаяннаму пошуку, распрацоўкам і засваенню новых тэхналогій, прымяненню сучаснага абсталявання, выкарыстанню высакаякаснай натуральнай экалагічнай сыравіны і арыгінальнай рэцэптуры, якія базіруюцца на глыбокіх навуковых даследаваннях шэрагу акадэмій і НДІ Беларусі, Расіі і Украіны.*



На прадпрыемстве адраджаюцца традыцыі вытворчасці прадукцыі на аснове вінаграднай сыравіны з Балгарыі і Малдовы, на чарзе — ІСПАНСКАЯ і ІТАЛЬЯНСКАЯ калекцыі.

### Гэта цікава ведаць

## Цвярозасць — норма жыцця...

З даўніх часоў у Беларусі п'янства ўсяляк ганілася. Напрыклад, жыхары Полацкага княства нават у час свята лічылі, што сёмай чаркай хмяльнога зелля можна ўгнявіць Бога, бо пасля такой дозы алкаголю чалавекам авалодвала нячыстая сіла, і пачыналіся сваркі, перабранкі і цяганне за валасы. Таму тых, хто перабіраў норму, палачане пераставалі паважаць.

У Вялікім княстве Літоўскім (ВКЛ) грамадзянскія правы п'яніц нават не ахоўваліся законам. Гэта знайшло адлюстраванне ў адной з прававых нормаў такога ўнікальнага для таго часу дакумента, як Статут ВКЛ 1588 года. У ім гаворыцца, што, калі чалавек пасля нанесеных яму ран на працягу месяца п'янстваваў, а потым ад гэтых ран памёр, то людзі, што прычынілі яму цялесныя пашкоджанні, да крымінальнай адказнасці за смерць п'яніцы не прыцягваліся.

Вялікую ролю ў барацьбе за цвярозасць адыгрывала ў сярэднія вякі мінулага тысячагоддзя праваслаўная царква. У 1558 годзе ўзнікла першае царкоўнае грамадства цвярозасці. Згодна з указам свяцейшага Сінода, па ўсёй Расіі і ў беларускіх губернях сталі ўзнікаць царкоўныя Брацтвы, якія ставілі перад сабой задачу па барацьбе з п'янствам.

Сёння асновай асноў таксама з'яўляецца навядзенне парадку на рынку алкагольных напояў і, адпаведна, культура піцця, бо яны былі і застаюцца неад'емным спадарожнікам жыцця многіх людзей. **Паводле меркавання генеральнага дырэктара РУП «Мінск Крышталь» Леаніда КУЧАРАВАГА**, у нашай краіне ў асноўным завяршыўся працэс фарміравання ідэалогіі. Адпаведна, у ёй адлюстроўваюцца пытанні здаровага ладу жыцця, а значыць — і скарачэння спажывання алкаголю. У антыалкагольных кампаніях ранейшых часоў, разважае кіраўнік прадпрыемства, вытворцы алкаголю станавіліся заложнікамі сітуацыі, іх работа падавалася як шкодная. Але як гэта ні парадаксальна, упэўнены Леанід Міхайлавіч, **нямногія ўнеслі такі салідны ўклад у фарміраванне здаровага ладу жыцця, як РУП «Мінск Крышталь», які выцесніў з алкагольнага рынку нізкапробную прадукцыю праз павышэнне якасці сваіх вырабаў і стварэннем іх шырокага асартыменту, у тым ліку і аздараўленчага накірунку**. Як прыклад — асваенне і выпуск прыроднай пітной вады, якая здабываецца з уласнай экалагічна чыстай артэзіянскай свідравіны глыбінёй 290 метраў.



## Крэда РУП «Мінск Крышталь» — якасць і бяспечнасць выпускаемай прадукцыі

Прадпрыемству ўручаны сертыфікат адпаведнасці НАССР на аснове прынцыпаў аналізу рызыкі і крытычных кантрольных кропак. Яшчэ ў 2000 годзе «Крышталь» укараніў сістэму менеджменту па стандарту ISO серыі 9000. Асвоіў «новую версію» ISO 9001-2001. Аднак гэтых сертыфікатаў недастаткова. Усё большае значэнне набірае стандарт НАССР. Ён кантралюе не сістэму кіравання прадпрыемства, а вытворчы працэс. Ацэньваюць крытычныя кропкі — вызначаюць самыя «тонкія» месцы тэхналогіі і ацэньваюць іх магчымы ўплыў на якасць канечнай прадукцыі.

Для еўрапейцаў НАССР стаў альфай і амегай. Асабліва калі размова заходзіць аб харчовым рынку. У красавіку 2004 года Еўрапарламент наклаў забарону на імпарт у краіны ЕС харчовых тавараў без сертыфікату НАССР. Гэтае рашэнне ўступіла ў сілу з 1 студзеня 2006 года, а гэта значыць: РУП «Крышталь» у нагу з еўрапейскім часам.

У 2004 годзе РУП «Мінск Крышталь» стала трэцім у Беларусі, укараніўшым стандарт ISO 14001-2005: уплыў вытворчасці на навакольнае асяроддзе. У свеце вельмі паважліва адносяцца да гэтага экалагічнага сертыфіката. Зрэшты, напрамую наяўнасць гэтага дакумента не ўплывае на збыт, але з'яўляецца важным аргументам у станоўчым фарміраванні іміджу прадпрыемства. Бо на тым жа еўрапейскім рынку буйных вытворцаў даўно ўстанавілася няпісанае правіла: незахаванне абароны навакольнага асяроддзя сведчыць аб слабасці тэхналогіі прадпрыемства.

**Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мінск Крышталь» віншуе ўсіх з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь!**

## Фірменны гандаль

**Важнае месца ў дзейнасці прадпрыемства «Мінск Крышталь» удзяляецца фірменнаму гандлю, сетка якога налічвае 19 фірменных магазінаў амаль ва ўсіх рэгіёнах агульнай плошчай больш за 3000 квадратных метраў.**

Высокая культура гандлю, сучасныя інтэр'еры, прыгожа афармленыя вітрыны і паліцы з шырокім выбарам якасных напіткаў, наяўнасць яркіх плакатаў — гэта далёка не поўны спіс элементаў фірменнага стылю работы магазінаў РУП «Мінск Крышталь».

**Адрасы фірменных магазінаў:**

- «Крышталь-100», **г. Мінск**, вул. Варвашэні, 8, тэл. (8-017) 284-33-23
- «Два буслы», **г. Мінск**, вул. Кастрычніцкая, 15, тэл. (8-017) 227-56-69
- «Крышталь», **г. Мінск**, вул. Кастрычніцкая, 15а, тэл. (8-017) 227-14-05
- «Чарадзей», **г. Мінск**, вул. Макаёнка, 13б, тэл. (8-017) 264-80-28
- «Крышталь», **г. Магілёў**, вул. Першамайская, 16, тэл. (8-0222) 22-53-90
- «Крышталь», **г. Гродна**, вул. Троіцкая, 19, тэл. (8-0152) 77-28-65
- «Крышталь», **г. Шчучын**, вул. Савецкая, 1, тэл. (8-01514) 24-776
- «Крышталь», **г. Іўе**, вул. Дружбы, 2, тэл. (8-01595) 26-180
- «Крышталь», **г. Салігорск**, вул. Леніна, 1б, тэл. (8-01710) 42-844
- «Крышталь», **г. Дзяржынск**, вул. К. Маркса, 12, тэл. (8-01716) 54-108
- «Крышталь», **г. Жодзіна**, вул. 50 гадоў Кастрычніка, тэл. (8-01775) 33-581
- «Крышталь», **г. Беразіно**, вул. Перамогі, 1, тэл. (8-01715) 55-234
- «Крышталь», **г. Барысаў**, вул. Трусава, 32, тэл. (8-01777) 50-564
- «Крышталь», **п. Весялова** Барысаўскага р-на, тэл. (8-01777) 79-277
- «Крышталь», **в. Сноў** Нясвіжскага р-на, тэл. (8-01750) 56-277
- «Крышталь», **г. Любань**, вул. Сацыялістычная, 22, тэл. (8-01794) 51-188
- «Крышталь», **п. Школьны** Стаўбцоўскага р-на, тэл. (8-01717) 35-107
- «Крышталь», **п. Урэчча** Любанскага р-на, в. Заводская, 1, тэл. (8-01594)-52-231
- «Крышталь», **г. Слуцк**, вул. 14 Партызан, 37, тэл. (8-01795) 25-426

*На прадпрыемстве выпрацавана ўласная палітыка ў галіне якасці. Сярод асноўных яе накірункаў задачы як абнаўленне абсталявання і ўдасканаленне тэхналогій, пашырэнне асартыменту прадукцыі, эфектыўнага выкарыстання навукі, так і асваенне новых рынкаў збыту з выкарыстаннем перадавых метадаў менеджменту і маркетынгу, стварэння і прасоўвання брэнда «Крышталь».*













1. Пітная негазіраваная вада «Крышталь» — для вашага здароўя.
2. Адна з вышэйшых узнагарод — гран-пры «Прадукт года 2006».
3. Афарміцель гатовай прадукцыі Ганна Пінчук.
4. У цэху вытворчасці і разліву.
5. У тэхналагічным працэсе задзейнічаны высокапрадукцыйныя лініі.

**_Галоўнай і нязменнай каштоўнасцю дня мінулага, сённяшняга і будучага РУП «Мінск Крышталь» з'яўляецца калектыў прадпрыемства._**

*Таму ў сваім лідарстве на прадпрыемстве ўпэўненыя. Тут цвёрда ведаюць: пройдзе яшчэ сотня гадоў, зменяцца пакаленні, але пакуль будзе запатрабавана алкагольная прадукцыя — галоўнай гандлёвай маркай у Беларусі будзе «Крышталь».*
















### Карысна ведаць

**Асновай многіх відаў прадукцыі РУП «Крышталь» з'яўляецца крэмніевая вада**. Спажыўцы прадукцыі з маркай «Крышталь», у тым ліку і замежныя, упэўнены: беларускі крэмень, які тут выкарыстоўваецца для змякчэння вады, з'яўляецца своеасаблівым сімвалам Беларусі. Крэмень моцны характарам, мяккі душой, сцвярджаюць яны.

ДУ НДІ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава Міністэрства аховы здароўя ў выніку эксперыментальных навуковых даследаванняў расшыфраваў механізм дзеяння крэмніевай вады (падвергнуты спецыяльнай апрацоўцы — фільтрацыі праз чорны крэмень) на арганізм як здаровых жывёл, так і пухліна-носьбітаў. Згодна з заключэннем ДУ НДІ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава № 31781 ад 12.12.2001 г., «атрыманыя даныя даюць важкія падставы рэкамендаваць насельніцтву Беларусі спажыванне крэмніевай вады вытворчасці РУП «Мінск Крышталь» з агульнаўзмацняльнай мэтай для павышэння антыаксідантнага статуса арганізма».

6. У фірменным магазіне працуюць загадчыца секцыі Вольга МАЙСІНОВІЧ і прадавец Вольга ГАРДЗЕЙ.
7. «У такой упакоўцы нашу прадукцыю ахвотна набываюць замежныя госці», — кажа інжынер Алеся БЫЧКОВА.
8. Гэта толькі маленькая частка шматлікіх узнагарод, атрыманых за апошнія гады на буйных айчынных і міжнародных выставах.
9. Асобае месца на тэрыторыі прадпрыемства займае невялічкая пабудова, адкуль да глыбокіх гарызонтаў пітной вады прабурана свідравіна. Якасная вада — залог якасці канечнай прадукцыі.
10. У музеі прадпрыемства можна ўбачыць гэты знак, атрыманы на сусветнай рымскай выстаўцы 1911 года, як вышэйшую ўзнагароду.
11. «Музей прадпрыемства — гэта сотні экспанатаў, якія распавядаюць пра больш як 100-гадовую гісторыю вытворчасці», — кажа старшы адміністратар ФОК Анатоль ГУСЬКО.
12. На занятках у зале ФАКа.

## РУП «Мінск Крышталь» уваходзіць у першую дзесятку буйнейшых падаткаплацельшчыкаў краіны

### Пазіцыянаванне і канкурэнтныя перавагі брэнда «Крышталь»

Вядомасць гандлёвай маркі, адпаведнасць прадукцыі міжнародным стандартам, пастаянная гатоўнасць і здольнасць дакладнага выканання запытаў пакупнікоў. **Слова «Крышталь» (Кристалл) як таварны знак валодае вялікім патэнцыялам**. Па-першае, гэтае слова лёгка запомніць. Па-другое, яго значэнне не патрабуе тлумачэнняў: яно асацыіруецца з чысцінёй і дасканаласцю, як звычайна характарызуюць прыродны крышталь. Да таго ж яно практычна нязменна гучыць і захоўвае пры гэтым сэнсавае значэнне практычна на ўсіх еўрапейскіх мовах. Амаль аднолькава выглядае ў адлюстраванні шрыфтам кірыліцай ці лацініцай.

### У жорсткіх умовах курс — на знешнія рынкі

**Прадпрыемства праводзіць актыўную палітыку аднаўлення сваіх знешнеэканамічных пазіцый, у тым ліку і ў Расіі.** Гэта не толькі эканамічная задача, але і пытанне прэстыжу. Таму з кожным годам РУП «Мінск Крышталь» становіцца ўсё больш актыўным суб'ектам экспартна-імпартных адносінаў. Дастойны ўдзел у міжнародных выставах і конкурсах-дэгустацыях садзейнічаў умацаванню атмасферы даверу, якая склалася ў сусветных дзелавых колах, і павышэнню аўтарытэтнасці яго іміджу, пашырэнню кола пакупнікоў і прыхільнікаў брэнда «Мінск Крышталь» у многіх краінах свету. Прадпрыемства дэманстравала дасягненні ў галіне якасці лікёра-гарэлачных вырабаў на знакамітых выставах: «Каралеўскі тыдзень» у Англіі, «United Vodka» ў Бельгіі, «Grunewoche» (Зялёны тыдзень) у Германіі.

РУП «Мінск Крышталь» мае заслужаную міжнародную рэпутацыю надзейнага дзелавога партнёра, уносіць дастойны ўклад у развіццё Беларусі.

*У склад вытворча-гандлёвага Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінск Крышталь» уваходзяць 6 філіялаў, якія як і галаўное прадпрыемства, маюць багатую гісторыю і традыцыі. Гэта:*

- тры спіртзаводы — **Хотаўскі, Урэчскі, Бярэзінскі**
- тры крухмальныя заводы: **Весялоўскі, Любанскі, Сноўскі**.

Зараз у філіялах РУП «Мінск Крышталь» — сучасных мадэрнізаваных вытворчасцях — выпускаецца рэктыфікат і сырэц, крухмал і харчовыя вырабы, вырошчваюцца лекавыя і вострадухмяныя травы, гатуюцца для асноўнай вытворчасці натуральныя раслінныя інгрэдыенты — асновы для бальзамаў, настоек і іншых відаў прадукцыі гандлёвай маркі «Мінск Крышталь».

*Зацікаўленыя бакі запрашаем да супрацоўніцтва!*

**Нашы рэквізіты:**
**Рэспубліка Беларусь, 220030, г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 15.**
**Тэл./факс: (+375-17) 227-44-69. http://www.kristal.by**
**Аддзел знешнеэканамічнай дзейнасці — тэл./факс: 289-13-88**






## Нацыянальны каларыт і багацце смаку

Фірменыя вырабы прадпрыемства «Мінск Крышталь» выгадна адрозніваюцца і запамінаюцца не толькі лепшым еўрапейскім стандартам па якасці і ўдалымі назвамі, але і сучасным дызайнам бутэлек і яркасцю этыкетак, разнастайнасцю і зручнасцю ўпакоўкі... Асаблівая ўвага ўдзяляецца выпуску прадукцыі ў сувенірным і падарункавым выкананні, якое найбольш поўна перадае нацыянальны каларыт. Па жаданню пакупніка прадукцыя ў сувенірным выкананні ўпакоўваецца ў падарункавыя шкатулкі, каробкі і футляры. Да святаў і падзей дзяржаўнага значэння, знакавых дат і юбілеяў вядучых прадпрыемстваў рэспублікі РУП «Мінск Крышталь» забяспечвае выпуск прадукцыі ў эксклюзіўным выкананні.

Матэрыялы рэкламна-інфармацыйнай старонкі падрыхтаваў Уладзімір ЗДАНОВІЧ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# ПЯТНІЦА, 2 САКАВІКА

**6.00, 16.50 Серыял «Усё змяшалася ў доме...».**
**6.45, 0.50** Дзень спорту.
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 9.05** Прэс-агляд.
**7.10, 7.35, 8.10, 8.35** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**7.30, 8.30** «Дзелавое жыццё».
**9.10 Серыял «Маёр Ветраў».**
**10.05** «Шпілька».
**10.35, 17.50 Серыял «Каханне як каханне».**
**11.30** «Эпоха». Тадэвуш Касцюшка.
**12.10** «Сфера інтарэсаў».
**12.30 Меладрама «Ганна і Камандор».**
**14.00** «Усе стыхіі».
**14.30** «Брытва Акама».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Мультфільмы.
**15.50 Серыял «Старшакласнікі».**
**16.20, 1.00 Серыял «Міліцэйская акадэмія».**
**19.35** «Зона Х».
**19.55** Музычныя вечары з Прэзідэнцкім аркестрам Рэспублікі Беларусь.
**21.00** «Панарама».
**21.40** «Культурныя людзі».
**22.10 Драма «Таварыства мёртвых паэтаў».**

**7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.30** Нашы навіны.
**7.05** «Наша раніца».
**9.05 Серыял «Талісман».**
**9.55 Серыял «Сёстры па крыві».**
**10.50** «Ералаш».
**11.05** «Прывітанне, я ваша цётка, Таццяна Васільеўна».
**12.00** «Малахаў+».
**13.05 «Капітанскія дзеці». Маст. фільм.**
**14.00** «Дэтэктывы».
**14.30** «Кантрольная закупка».
**15.00** «Лаліта. Без комплексаў».
**16.10 Серыял «Тайны Смалвіля».**
**17.05** «Няхай гавораць».
**18.15, 21.00, 23.45** Навіны спорту.
**18.20 Серыял «Зачараваны».**
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Розыгрыш».
**22.15** «Сярэбраны грамафон».
**23.50 Маст. фільм «Амерыканскія кузены».**
**1.40 Баявік «Егер».**



*Лёс разлучыў двух старых сяброў і звёў іх зноў тварам да твару ў смяротнай схватцы. Адзін з іх — егер, другі — зэк па мянушцы Звяруга.*

ЛАД

**7.00** «Ранішняя падзарадка».
**8.00, 17.30 Серыял «Салодкі плод».**
**8.50, 15.00** Навіны культуры.
**9.00** «У гэты дзень».
**9.05, 18.30 Серыял «Гарадскі раманс».**
**9.55, 21.05 Серыял «Спадары афіцэры».**
**10.50, 19.20 Серыял «Залатая цешча».**
**11.20** «Ядзім дома».
**11.45, 13.40** «Анекдот. LAD».
**12.10** «Святло далёкай зоркі. Уладзімір Карпаў».
**12.35** Да 65-годдзя Уладзіміра Кавалёнка. Дак. фільм «Хлопец з вёскі Белае».
**13.05** Мультфільм.
**13.15** «Спорт, спорт, спорт...». Да 80-годдзя ДАСААФ.
**14.00** «Рамансіяда» на «Залатым шлягеры-2000».
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. 7,5 км. Жанчыны.
**16.35 Серыял «Прыгоды Скіпі».**
**17.00** «Жансавет».
**19.55** «Беларуская часінка».
**20.50** «Калыханка».
**22.05** «Правы чалавека».
**22.20** «Дэталі». Генетычнае ўстанаўленне бацькоўства.
**22.50** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**0.25** Баскетбол. НБА. Агляд тыдня.
**0.55** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

ТВ РЕН

**6.05, 17.20** «Міншчына».
**6.15, 7.40** «З чаго пачынаецца раніца».
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**8.40** «Аўтапанарама».
**9.00 «Салдаты 8». Серыял.**
10.00 «Сталкер».
**10.40** «Тэма дня».
**10.45** «Наша справа».
**11.00** «Гадзіна суда: справы сямейныя».
**12.00** «Гадзіна суда».
**13.00** «Асабісты інтарэс».
**13.50, 18.25 «Пяць мінут да метро». Серыял.**
**14.50** «Геркулес». Мультсерыял.
**15.15** «Неверагодныя гісторыі».
**16.00** «Ёсць кантакт».
**16.50 Серыял «Трое зверху».**
**17.30** «Званая вячэра».
**20.05** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, малыш».
**20.30 Камедыя «Попстар».**
*Джэйн — звычайная дзяўчына, Джэй — «славутасць», у яго свая рок-група і нават свае фэны. Яму патрэбен хтосьці, на каго можна перакласці выкананне хатняга задання.*
**22.55** «Відзьма-нявідзьма».
**23.30 Баявік «Чалавек-цень».**
**1.05** «Па поўнай праграме».
**1.45 «4400». Серыял.**

Мир

**6.00** Зараджайся!
**7.30 Серыял «Сага аб Фарсайтах».**
**8.15, 12.00, 22.25** Студыя 60—90.
**8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30** «Навіны Садружнасці».
**8.45, 13.45** Урокі англійскай мовы.
**9.00** Даведнік.
**9.30** Ток-шоу «Спрэчная тэрыторыя».
**10.30** Дак. серыял «Гісторыя злачынстваў».
**12.15, 22.30 Маст. фільм «Тэгеран-43».**
**14.00** Дзіцячы сеанс.
**15.00** Дак. серыял «Сливки общества».
**16.00 Серыял «Чалавек мора».**
**17.00** Дак. серыял «Вясельныя вар'яцтвы».
**18.00** Акцэнты.
**18.15** Канцэрт. Арт-група «Беларусы».
**19.45** «Цік-так».
**20.00** Лепшае з Джэнтльмен-шоу.
**21.00 Серыял «Бушыдо — шлях воіна»**
**22.00** Акцэнты+.

ВосьМой

**7.00** «Сад і агарод плюс».
**7.15, 10.55, 21.05, 23.15** «Метэапрагноз».
**7.20 Маст. фільм «Кактэбель».**
**8.55** «К-гульня».
**9.00** «Дом жывых гісторый».
**9.30** «Гурман-клуб».
**9.50 Серыял «Палюбоўнікі пустыні».**
**10.50, 21.00** Інфармбюро «Міжнароднае».
**11.00 Меладрама «Сісі».**
**13.00, 14.15** «Тэлечат — «8 канал».
**14.00** «Лаві момант!».
**16.30** Мультпарад.
**16.40** «К-відэа для дзяцей».
**17.00 Маст. фільм «Сябар».**
**18.40** «Дзіно».
**19.00** Дак. серыял «Апошні міф».
**19.40** «Сад і агарод».
**19.45 Серыял «Знесеныя ветрам».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.10** «Каралі муай тай».
**21.25 Драма «Акіян кахання».**

РОССИЯ

**7.00** Добрай раніцы, Расія!.
**9.10** «Мой сярэбраны шар. Пётр Алейнікаў».
**10.00 Серыял «За ўсё табе дзякую».**
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30, 14.20, 17.20, 19.45** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.50 Серыял «Ад'ютанты кахання».**
**13.45, 16.40, 18.40** Весткі. Дзяжурная часць.
**14.40** Пакой смеху.
**15.30** Суд ідзе.
**17.40 Серыял «Анёлахоўнік».**
**20.05** «Добрай ночы, малышы!».
**20.15** «Еўдакімаўскія гулянні».
**23.50 Камедыя «Жыццё з дзецьмі».**

НТВ БЕЛАРУСЬ

**8.00** «Сёння раніцай».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Я ўсё вырашу сама».**
**12.05** «Дзве праўды».
**13.30 Серыял «Афіцэры».**
**14.20 Серыял «Кат».**
**15.05** «Авіятары».
**15.35** «Агляд. Выратавальнікі».
**16.25 Серыял «Поўны наперад».**
**18.20** «Асарці».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.40** «Следства вялі...».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне: Ліівіненка. Чыста англійскае забойства».
**21.15 Баявік «Успышка».**
*Федэральны суддзя рыхтуецца да самага «ўзрыўнога» працэсу ў сваёй кар'еры — справы аб карупцыі ў вышэйшых ваенных колах.*
**23.00 Драма «Гарбатая гара».**



*Джэк — памочнік уладальніка ранча,Эніс — каўбой радэо. Правёўшы некалькі месяцаў разам, яны разумеюць, што іх сяброўства перарасло ў нешта большае.*

ЦЕНТР

**5.00** Канал «Настрой».
**7.30, 20.15, 1.35 «Расплата за грахі». Серыял.**
**8.25 Маст. фільм «Бармен з «Залатога якара».**
**10.00** «Дэтэктыўныя гісторыі». «Гагарынскія галаварэзы».
**10.30, 13.30, 16.30, 23.30** Пятроўка, 38.
**10.45, 13.45, 16.45, 19.45** Падзеі.
**11.00** «У цэнтры ўвагі». «Замежныя грамадзянкі з падазронай рэпутацыяй».
**11.35, 17.45 Серыял «Адна справа на дваіх».**
**12.50** Дзелавая Масква.
**14.00** Небяспечная зона.
**14.30 «Супраць цячэння». Серыял.**
**15.30** Новая «Часінка».
**17.15** «У цэнтры ўвагі». «Не жаночая гэта справа».
**18.50** Ключавы момант.
**21.15** Момант ісціны.
**22.05** «Народ хоча ведаць». Ток-шоу.
**23.00** Падзеі. 25-я гадзіна.
**23.45 Маст. фільм «Круг другі».**
*Філасофская прытча аб галоўным доўгу жывых — пахаваць сваіх мёртвых.*
**2.25 «Дэтэктыў Джэк Фрост». Серыял.**
**3.40 «Сышчык пецярбургскай паліцыі». Дэтэктыў.**
**5.05** Мультфільм.

EUROSPORT

**7.30, 10.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Японіі.
**10.00** Санны спорт. Кубак свету ў Латвіі.
**11.30, 21.00, 2.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету ў Японіі.
**13.30, 16.45** Тэніс. Турнір WTA ў Катары.
**14.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі.
**15.15** Біятлон. Кубак свету ў Фінляндыі.
**18.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні (Вялікабрытанія).
**22.00** Дужэйшыя людзі планеты.
**23.00** Покер. Еўратур.
**0.00, 2.00** Футбол. 24 лепшыя клубы Еўропы.
**0.30** Экстрэмальны спорт.

## ФІЛЬМ ДНЯ

### «ПЕРШЫ» 22.10 «ТАВАРЫСТВА МЁРТВЫХ ПАЭТАЎ» (ЗША, 1989 Г.)

*Узнагароды: прэмія «Оскар», прэмія «Сезар», прэмія «Давід Дзі Данатэла» Італьянскай кінаакадэміі, прэмія Брытанскай акадэміі кіно; (1989 г.), прэмія «Залаты Экран» (Германія), прыз глядацкіх сімпатый МКФ у Варшаве; (1990 г.).*

1959 год. Закрыты прывілеяваны каледж для хлопчыкаў. Сямёра хлопцаў з класа цягнуцца да новага настаўніка англійскай мовы, які вучыць іх разумець літаратуру і любіць паэзію. Ад яго яны даведваюцца аб тайным «Таварыстве мёртвых паэтаў», якое калісьці існавала.

**Рэжысёр** — Пітэр Уір. **У ролях:** Робін Уільямс, Роберт Шон Леанард, Ітэн Хоўк, Норман Лойд.



Тэлесеткі

## Сюрпрыз для абаронцаў

**Спецыяльна для эфіру 23 лютага вядучыя праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!» Вольга Шлягер, Святлана Бароўская і Вольга Водчыц прайшлі «Курс маладога байца». Паненкі прымералі вайсковую форму, навучыліся збіраць аўтамат АК-74, вывучылі змесціва рэйдавага рукзака і нават паспрабавалі засвоіць страявы крок.**

Дапамаглі вядучым у гэтых занятках ваеннаслужачыя з разведвальнага батальёна 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады старшы лейтэнант Уладзімір Кармазін, малодшы сяржант Сяргей Сасіновіч і радавы Дзмітрый Лямешка.

Пакуль у ранішнім эфіры, прысвечаным Дню абаронцаў Айчыны, тэлевядучыя будуць дэманстраваць нованабытыя ўменні і знаёмасці больш падрабязна з армейскім жыццём, святочную абстаноўку ў студыі забяспечыць узорна-паказальны аркестр Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь. А ваенныя — яны людзі абавязковыя, калі сказалі, што святу быць, значыць, будзе!



Фота прэс-службы БТРК.

## На прастор, на шырокі... эфір

**Першы музычны тэлеканал, акрамя ўласна назвы, шмат да чаго ў сваёй біяграфіі можа дадаваць азначэнне «першы». Так, афіцыйна ён пачаў вяшчанне ў першы дзень вясны — 1 сакавіка 2002 года. Стаў першым у Беларусі інтэрактыўным і першым кругласутачным тэлеканалам. А сёлета адзначае свой першы юбілей — 5 гадоў.**

Свята, як абяцае адміністрацыя канала, стартуе ў эфіры Першага музычнага гэтаксама з першых хвілін 1 сакавіка. Спецыяльны лагатып, віншаванні ад зорак шоу-бізнэсу Беларусі і Расіі, святочны выпуск праграмы навін «120/80 news» і іншых — праграмы «О», «20-ка першых», «5-ка лепшых», «Maxi Life».

Дэкларованая інтэрактыўнасць Першага музычнага працягнецца ўвечары, калі ў сталічным клубе «Мілениум» адбудзецца прэзентацыя музычнага зборніка «Першы юбілейны», адмыслова выпушчанага да свята. У канцэрце-прэзентацыі выступяць папулярныя беларускія выканаўцы, а ві-джэі тэлеканала Люся Лушчык і Віталь Воднеў будуць «руліць» мерапрыемствам.

А 3 сакавіка Першы музычны арганізуе яшчэ больш масавы «выхад у народ» — на пляцоўцы ля Палаца спорту мяркуецца наладзіць шматгадзінную канцэртную праграму з удзелам не толькі беларускіх «зорак», а яшчэ і гасцей з Украіны і Прыбалтыкі. Словам, гэткая вялізная дыскатэка на свежым паветры.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Прыгожае жыццё

## «Міс Інтэрнэт Беларусь-2004» прэтэндуе на павышэнне ў званні

**На конкурс «Місіс свету» ад нашай краіны паедзе спецыяліст па аператыўна-вышуковай дзейнасці — лейтэнант міліцыі Алеся Ганчарова. Дарэчы, для беларускі гэта не першы ўдзел у конкурсах прыгажосці — у 2003 годзе Алеся заваявала званне «Віцэ-міс Вясна» ў міжнародным міжвузаўскім конкурсе грацыі і артыстычнага майстэрства, а ў 2004 годзе стала «Міс Інтэрнэт Беларусь». Потым скончыла Акадэмію МУС, выйшла замуж і нарадзіла дачку — у прынцыпе, выканала ўсе пункты ўмоў для ўдзелу ў конкурсе «Місіс свету».**



Нароўні з іншымі жанчынамі — абавязкова якім за 18, замужнімі і з дзецьмі — Алеся Ганчарова акурат у Міжнародны жаночы дзень, 8 Сакавіка, выйдзе на подыум у Сочы. 48 канкурсанткам давядзецца не толькі дэманстраваць жаноцкасць, прыгажосць і абаянне, але таксама падрыхтаваць нумар для конкурсу талентаў, паказаць свае кулінарныя ўменні, прадэфіляваць у нацыянальным касцюме, пацвердзіць выдатную спартыўную форму і здаровы лад жыцця — пракаціцца на горных лыжах. Пяці фіналісткам дастануцца ўпрыгажэнні на суму не менш як 10 тысяч долараў кожнай, а пераможца атрымае карону «Місіс свету», кошт якой ацэньваецца прыкладна ў 50 тысяч долараў ЗША. А да кароны, зразумела, прыкладаюцца кветкі, апладысменты і папулярнасць — конкурс будзе трансляваецца па многіх тэлеканалах.

Між іншым, беларускія жанчыны маглі і раней «засвяціцца» ў шэрагах перадавых сусветных місіс — спявачка Анжэліка Агурбаш, якая стала «Місіс Расія-2002», атрымала права прадставіць Расію на фінале «Місіс Сусвету». Але знайшлося мноства прычын — і асабістага, і творчага характару, — якія не дазволілі Анжэліцы паўдзельнічаць у конкурсе. Але, як сцвярджае сама артыстка і маці цяпер ужо траіх дзяцей, права ўдзелу за ёй захавалася.

**Ліна МАЛІНІНА.**

## Патэнцыяльных прызыўнікоў ужо рыхтуюць да службы ў арміі

**Днямі ў ліцэі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фінішавала акцыя «Хутка арміі роднай будзе папаўненне».**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» Андрэй Красуцкі, начальнік штаба паста № 1 горада-героя Мінска, гэта акцыя праводзілася ўпершыню ў рамках праекта грамадска-патрыятычнага выхавання «Я грамадзянін рэспублікі Беларусь». Яе ініцыятарам выступіў Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі пад патранажам камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама.

Акцыя стартавала 22 лістапада 2006 года, калі сустрэча моладзі дапрызыўнага ўзросту з прадстаўнікамі Міністэрства абароны праходзіла ў выглядзе віртуальнай экскурсіі з выкарыстаннем шырокіх магчымасцяў мультымедыя: юнакам дэманстравалі і расказвалі, што такое Узброеныя сілы, якія этапы іх чакаюць наперадзе — ад ваенкамата да дэмабілізацыі.

У рамках акцыі для яе ўдзельнікаў былі арганізаваны ваенна-спартыўныя спаборніцтвы, конкурсы плакатаў, малюнкаў, песень, святочныя праграмы (у прыватнасці 16 лютага юнакі і дзяўчаты, якія нясуць вахту памяці на пасту № 1 г. Мінска віншавалі з 12-годдзем роту ганаровай варты). У апошні дзень правядзення акцыі да помніка на плошчы Перамогі былі ўскладзены вянкі.

**Ірына ПРЫМАК.**

У аб'езд

## У Мінску закрываецца рух па вуліцы Заводскай

**У Мінску рух усіх відаў транспарту па вуліцы Заводскай у пасёлак Веснінка будзе закрыты. Адпаведнае распараджэнне прыняў Мінгарвыканкам.**

Згодна з дакументам у сувязі з будаўніцтвам вуліц і інжынерных сетак з 21 лютага па 31 ліпеня гэтага года закрываецца рух усіх відаў транспарту, у тым ліку гарадскога аўтобуснага маршруту № 91 па вуліцы Заводскай — ад вуліцы Піянерскай да разваротнага кальца. ДУ «Сталічны транспарт і сувязь» даручана арганізаваць рух аўтобусаў № 91 па зменненаму маршруту.

Рашэнне аб закрыцці руху транспарту на гэтым участку прынятае ў сувязі са зваротам ЗАТ «Трэст Прамбуд», якое будзе весці будаўніцтва вуліц і інжынерных сетак.

**Кар. БЕЛТА.**

# СУБОТА, 3 САКАВІКА

**6.30** «Дзень спорту».
**6.40** Мультфільм.
**7.00** Дак. серыял «Планета навук».
**7.30** «Існасць».
**7.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.10** «Ранішняя хваля».
**9.40** «Кухня гумару».
**10.15** «Альманах падарожжаў».
**10.45** «Вось такія пірагі».
**11.25** «У свеце матораў».
**12.10 Трагікамедыя «Прыгоды графа Няўзорава».**
**13.35** «Раўнавага: асяроддзе пражывання».
**14.05** Мужчынскі характар».
**14.30** «Арбіты жыцця».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зона Х».
**15.50** «Зямельнае пытанне».
**16.10** Дак. серыял «Грэцыя з вышыні птушынага палёту».
**17.10** «ЕўраФэст. Дзень за днём».
**17.25** «Вакол планеты».
**17.55** «Ваша лато».
**19.10 Камедыя «Братысапернікі».**
**21.00** «Панарама».
**21.40 Трылер «Маёнтак «Халодны ручай».**



*Іх мары збыліся: яны — уладальнікі прыгожага і вялікага маёнтка. Але крывавае мінулае сядзібы, аб якім героі «забыліся» папярэдзіць, уваходзіць у іх жыццё разам з былым уладальнікам, злачынцам-псіхапатам.*
**23.45** «Галерэя вобразаў».
**0.10 Драма «Прыстанішча анёлаў».**

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05 Серыял «Сябры».**
**9.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.10** Мультфільмы.
**12.10** «Сакрэты фільмаў аб дзікай прыродзе». Дак. серыял.
**12.45** «Тэлечасопіс «Саюз».
**13.30** «Звярынец».
**14.00 Маст. фільм «Мой ласкавы і пяшчотны звер».**
**16.10** «Марк Твен. Атакуючы анёл».
**16.40** «Мікалаю Растаргуеву — 50!». Юбілейны канцэрт у Крамлі.
**18.45** «Уладальнік гары».
**20.00** Вялікая палітыка.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Зорны цырк».
**23.05 Маст. фільм «Знойдзены рай».**
**0.55 Маст. фільм «Жанаты сем гадоў».**
*Одры і Алан жанатыя 7 гадоў. У іх ёсць дачка Каміла. Штодзённая руціна заглушыла любоўныя пачуцці і жаданні мужа і жонкі. Не знаходзячы разумення ў жонкі, Алан пачынае тайна заляцацца да іншых.*

ЛАД

**8.00** «Дабравест».
**8.30** «Дзіцячая гадзіна».
**9.35** Мультфільм.
**9.45 Серыял «Ясон і арганаўты».**
**10.30** «Добрыя навіны».
**10.55** «Школа рамонту».
**11.45** «Сезон у дачы».
**12.15** Рок-опера «Анджэла і іншыя».
**14.40** «Плошча мастацтваў».
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. 10 км. Мужчыны.
**16.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**18.35** «Святло далёкай зоркі. Віктар Тарасаў».
**19.00** «Лёс чалавека». Ірына Дзянісава.
**19.30 Камедыя «Утопім Мону».**
**21.15** «Анекдот. LAD».
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Ліверпуль»—«Манчэстар Юнайтэд».
**23.25** Баскетбол. НБА. «Дэтройт Пістонз»—«Маямі Хіт».

ТВ РЕН

**6.10** Дак. фільм «Дзікая планета»: «Бяспечныя прыстанішчы».
**7.05** «Ваенная тайна».
**7.50** «З дакладных крыніц».
**8.05 Фільм дзецям «Калі верыць Лапатухіну». 1-я серыя.**
**9.10** «Голы кухар».
**9.45** «Наш дом».
**10.10** «Мінск і мінчане».
**10.40** «Крымінальнае чтыво».
**11.30** «Лёсам напісаныя радкі».
**12.00 «Татачкаў сынок». Серыял.**
**13.00** «Перапынак». Мультсерыял.
**13.45 Меладрама «Безыменная зорка». 1-я серыя.**
**14.50** «Дарагая перадача».
**15.15** «Народжаныя ў СССР».
**16.00** «Надзвычайныя гісторыі»: «Крык лавіны».
**16.55** «Відзьма-нявідзьма».
**17.30** «Наша справа».
**17.40** Дак. фільм «Гучная справа»: «Справа Сычова: маўчанне салдат».
**18.35** «Прыватныя гісторыі».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТВ-спорт».
**20.10 Трылер «Пагоня».**
**22.00** «Схема смеху».
**22.50 «Мяне завуць Эрл». Серыял.**
**23.15 Маст. фільм «Славутасць».**



*Пісьменнік і журналіст, які перажывае асабісты і творчы крызіс, вырашыў крута змяніць сваё сумнае жыццё, акунуўшыся ў стракаты свет артыстычнай і творчай эліты.*
**1.25** «In reality».
**1.50 Камедыя «Попстар».**

Мир

**6.00, 15.00** Дак. серыял «Хіт-парад дзікай прыроды».
**7.30** Мультсерыял «Мобі Дзік».
**8.00 Серыял «Маўглі».**
**9.00** Мар, дзейнічай, будзь!
**9.30** «Хіт-экспрэс».
**10.30** Лепшыя праграмы Садружнасці.
**11.00** Даведнік.
**11.30, 14.30, 17.30, 20.30** «Навіны Садружнасці».
**12.00** Любімыя акцёры: Георгій Мартынюк.
**12.15 «Следства вядуць Знатакі. Шантаж».**
**14.00** Студыя 60—90.
**14.15** Казахстан: старонкі гісторыі.
**16.00** Аднакашнікі.
**17.00** Камедыйны кактэйль.
**18.15** Чамадан гісторый.
**18.45** Дак. серыял «Чароўная планета».
**19.45** «Цік-так».
**20.00** Спецыяльны рэпартаж.
**21.00 Маст. фільм «Гэта не я!».**
**23.00 Серыял «Х-мутант».**

ВосьМой

**9.00** «Сад і агарод».
**9.05, 21.00, 23.30** «Метэапрагноз».
**9.10** «Адзінка ў кубе».
**9.30** «Дзіно».
**9.55** «К-гульня».
**10.00** «Каралі муай тай».
**10.15 Маст. фільм «Акіян кахання».**
**12.15 Маст. фільм «Сісі — маладая імператрыца».**
**14.30** Дак. серыял «Смяротная рызыка».
**15.15** «Мультпарад» па выхадных.
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Серыял «Міс Марпл вядзе расследаванне».**
**18.45** «Сад і агарод плюс».
**19.00 Камедыя «Вяселле ў Малінаўцы».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Малышка за мільён».**

РОССИЯ

**7.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**7.10** Добрай раніцы, Расія!
**9.05** «Ваенная праграма».
**9.30** «Ранішняя пошта».
**10.00** «Сто да аднаго».
**11.10** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.20, 18.00** «Сакрэт поспеху».
**11.40** Гарадок. Дайджэст.
**12.15** Суботнік.
**13.00** Вакол свету.
**14.20 Дэтэктыў «Крымінальны талент».**
**15.40** Юбілейны канцэрт групы «Зямляне».
**17.20** Мясцовы час. Тыдзень у горадзе.
**19.10** «Кінескоп». Берлінскі кінафестываль.
**20.15** «Суботні вечар».
**22.10 Драма «Белы шквал».**
*Восенню 1960 года парусная брыганціна «Альбатрос» пад кіраўніцтвам капітана Шэлдана пайшла ў кругасветнае плаванне.*
**0.25 Трылер «Застацца ў жывых».**

НТВ БЕЛАРУСЬ

**9.00** «Без рэцэпта».
**9.30** «Агляд».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**12.00** «Кватэрнае пытанне».
**13.25** «Асабліва небяспечны!».
**14.05 Маст. фільм «34-ы хуткі».**
**15.45** Асарці.
**16.25** «Жаночы погляд». Яўген Дога.
**17.00 Меладрама «Мядзведжы пацалунак».**
**19.40** «Прафесія — рэпарцёр».
**20.10** «Праграма максімум».
**21.15** «Рускія сенсацыі».
**22.00** «Рэальная палітыка».
**22.35 Трылер «Злачынства і пакаранне па-амерыканску».**



*На першы погляд Разане зусім няма на што скардзіцца. Дзяўчына жыве ў прыгожым доме, але ніхто доўгі час нават не здагадваецца, якія драмы разыгрываюцца за яго сценамі.*
**0.15** «Мікс-файт М-1. Баі без правілаў».

ЦЕНТР

**5.25 «Горад прыняў». Маст. фільм.**
**7.00** Марш-кідок.
**7.30** Праваслаўная энцыклапедыя.
**8.00** Ключавы момант.
**8.45** АБВГДэйка.
**9.15 Фільм-казка «Як Іванка-дурань па цуда хадзіў».**
**10.45. 13.45, 16.45, 23.25** Падзеі.
**11.05** «Учынак». Ток-шоу.
**12.00** «Сто пытанняў дарослаюму».
**12.55** Гарадскі сход.
**14.00** Дак. фільм «Мікалай II, Аляксандра Фёдараўна і Рыгор Распуцін».
**14.50 Дэтэктыў «Выпадак са следчай практыкі».**
**17.00** «Крылатыя арэлі». Творчы вечар Яўгена Крылатава.
**18.00 «Пуаро Агаты Крысці». Дэтэктыў.**
**20.00** «Пастскрыптум».
**21.00 Баявік «Смяротная зброя-4».**
**23.40 Маст. фільм «Горад прывідаў».**
*Пасля няўдалай аферы дробны махляр пападае «пад каўпак» ФБР, а яго партнёр хаваецца ў Камбоджы.*
**1.50 Маст. фільм «Міг удачы».**
**2.55** «Музычная гісторыя». Ірына Алеграва.
**3.25 «Дэтэктыў Джэк Фрост». Серыял.**
**4.40** Мультфільм.

EUROSPORT

**3.30, 8.00, 14.45** Лыжнае двааборʼе. Чэмпіянат свету ў Японіі.
**5.30, 10.30, 18.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету ў Японіі.
**6.30, 9.15** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Японіі.
**12.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі.
**14.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Славеніі.
**15.15** Біятлон. Кубак свету ў Фінляндыі.
**16.45, 0.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні (Вялікабрытанія).
**19.00** Экстрэмальны спорт.
**19.30** Тэніс. Турнір WTA ў Катары.
**21.30** Бокс.
**0.45, 2.45** Навіны Еўраспорту.
**1.00** Баі без правілаў.

## ФІЛЬМ ДНЯ

### «ПЕРШЫ» 0.10 «ПРЫСТАНІШЧА АНЁЛАЎ» (ФРАНЦЫЯ—ІСПАНІЯ, 2001 Г.)

Несучыся насустрач невядомай будучыні, Серж ведае: у яго ёсць усяго тры дні на тое, каб выратаваць сваё каханне, тры дні, якія назаўсёды зменяць яго жыццё і лёс.

**Рэжысёр** — Андрэ Тэшыне. **У ролях:** Стэфан Рыдо, Лубна Азабаль, Махамед Хамайдзі, Ясміна Рэза.



# НЯДЗЕЛЯ, 4 САКАВІКА

**6.45** Мультфільмы.
**7.20** Дак. серыял «Планета навук».
**7.50** «Сузор'е надзей».
**8.30** «Брытва Акама».
**9.00, 12.00. 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.35** «Усе стыхіі».
**10.10** «Тайны смак».
**10.45** «Шпілька».
**11.20** «Здароўе».
**12.10 Меладрама «Вясна на Заречнай вуліцы».**
**13.55** «КомпаС».
**14.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Дак. фільм.
**15.55 Маст. фільм «Бег ад смерці».**
*Уцякач ад правасуддзя, якому няма дзе схавацца, удзельнічае ў смяротнай гонцы, учыняючы ўсё новыя злачынствы.*
**15.30** «Час кіно»
**18.05** «Суперлато».
**19.05 Дэтэктыў «Дзік Трэйсі».**



*Стылізаваная адаптацыя знакамітага комікса аб паходжаннях суперпаліцэйскага Дзіка Трэйсі.*
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.25** Святочны канцэрт, прысвечаны 90-годдзю беларускай міліцыі.
**0.35** «ЕўраФэст. Дзень за днём».

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропаведзь.
**9.15** Серыял «Сябры».
**9.50** «Бесталковыя нататкі».
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.05** «Ранішняя пошта».
**11.50** «Разумніцы і разумнікі».
**12.30** «Доктар Курпатаў».
**13.30** «КВЗ-2007».
**16.15** «Міжнародная панарама».
**16.35** Нядзельны «Ералаш».
**17.00** Памяці Юрыя Сянкевіча.
**18.05** «Мінута славы».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Дыханне планеты».
**21.35 «Паказваючы ахвяру». Маст. фільм.**
*Трыццацігадовы хлопец, які скончыў універсітэт, працуе ў «мінтоўцы», выступаючы ў ролі ахвяр крымінальных злачынстваў у ходзе следчых эксперыментаў.*
**0.55** «Камедзі Клаб».

ЛАД

**7.50** «Мір вашаму дому».
**8.00** «Дзіцячая гадзіна».
**9.05** Мультфільм.
**9.15 Серыял «Ясон і арганаўты».**
**10.00** «Як гэта робіцца».
**10.30, 13.05, 16.25** «ПРАсоўванне+».
**10.40** «Смачная раніца».
**11.10** «Сама сабе гаспадыня».
**11.40** «Спявай, душа!».
**12.10** «Гаспадар».
**12.40** «Слова пісьменніка».
**13.25** Біятлон. Кубак свету. Гонка праследавання. 10 км. Жанчыны.
**14.10** Мультфільмы.
**14.30** «Вас выклікае Спартландыя».
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Гонка праследавання. 12,5 км. Мужчыны.
**15.55** «Спорт, спорт, спорт…».
**16.40** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**18.55 Камедыя «Сцеражыся аўтамабіля».**
**20.35** «Тэлебарометр».
**20.50** «Анекдот. LAD».
**21.05** «Жаночая ліга».
**21.30 Трылер «Кроў і віно».**
**23.15** «Наша Russia».
**23.40** Хакей. НХЛ. Матч тура.

ТВ РЕН

**6.10** «Дзікая планета»: «У абдымках змей».
**7.05** «Суперняня».
**7.50** «Персей». Мультфільм.
**8.10 Фільм дзецям «Калі верыць Лапатухіну». 2-я серыя.**
**9.15** «Аўтапанарама».
**9.40** «Відавочца».
**10.30** «Вялікае снеданне».
**11.05** «Культурнае жыццё».
**11.35** «Добры дзень, доктар!».
**12.05 «Татачкаў сынок». Серыял.**
**13.05** «Перапынак». Мультсерыял.
**13.50 Меладрама «Безыменная зорка». 2-я серыя.**
**15.30** «Ecce homo».
**16.00** «Новыя падарожжы дылетанта».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Неверагодныя гісторыі».
**17.40** «Нацыянальны здабытак». Легенды і паданні.
**18.10** «Вялікія мазгаломы».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.45 Гістарычная драма «Забіць караля».**
**22.45** «Спартыўны тыдзень».
**23.15** Прафесійны бокс.
**0.15** «Па поўнай праграме».
**0.55 «4400». Серыял.**
**1.40 Трылер «Пагоня».**

Мир

**6.00, 15.00** Дак. серыял «Згубленыя светы».
**7.30** Мультсерыял «Мобі Дзік».
**8.00 Серыял «Маўглі».**
**9.00** «Мільён пытанняў аб прыродзе».
**9.15** Дзеці сонца.
**9.30** «Парад парадаў».
**10.30** «Хвост каметы».
**11.30, 14.30, 17.30** «Навіны Садружнасці».
**12.00** Любімыя акцёры: Леанід Браняві.
**12.15 «Следства вядуць Знатакі. Шантаж».**
**13.30** Дак. фільм «Кастры Ігара Шэхцера».
**14.00** Студыя 60—90.
**14.15** Сямейны альбом.
**16.00** Паэзія Арменіі.
**16.15** Любоўныя гісторыі.
**16.45** Арт-рэвалюцыя.
**17.00** Камедыйны кактэйль.
**18.15** Каму на Русі жыць добра.
**18.45** У нашу гавань заходзілі караблі.
**19.45** «Цік-так».
**20.00** «Разам».
**21.00 Маст. фільм «Святло маіх вачэй».**
**23.00 Серыял «Х-мутант».**

ВосьМой

**9.00, 18.55** «Сад і агарод».
**9.05, 21.00** «Метэапрагноз».
**9.10** «Адзінка ў кубе».
**9.30** «Дзіно».
**9.55** «К-гульня».
**10.00** Дак. серыял «Падарожжа са смакам». «Дамініканская рэспубліка».
**10.30 Маст. фільм «Малышка за мільён».**
**12.50 Маст. фільм «Цяжкія гады імператрыцы».**
**14.50** Дак. фільм «Ірландскія скакуны».
**15.45** «К-відэа для дзяцей».
**16.00 Фільм для дзяцей.**
**17.00 Маст. фільм «Дзевяць дзён аднаго года».**
**18.45** «К-відэа Топ-8».
**19.00 Камедыя «Маленькі купальшчык».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Баявік «Без твару».**

РОССИЯ

**7.00, 11.00, 14.00** Весткі.
**7.10 Казка «Эльф, які не верыў».**
**8.50** Мультфільмы.
**9.10** «Дыялогі пра жывёл».
**9.40** «Здароўе».
**10.10** «Сам сабе рэжысёр».
**11.10** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.20** «Гарадок. Дайджэст».
**11.50** «Смехапанарама».
**12.10** «Сяргей Парамонаў. Савецкі Раберціна Ларэці».
**13.05** Фитиль.
**14.20 Дэтэктыў «Крымінальны талант».**
**16.10** «Сумленны дэтэктыў».
**16.45** Юбілейны вечар Раймонда Паулса.
**19.00** «Весткі тыдня».
**20.00** «Спецыяльны карэспандэнт».
**20.25 Камедыя «Тайны агент кахання».**
*Што застаецца жанчыне, якую багаты муж пагражае выгнаць з дома і пакінуць без грошай?*
**22.15 Меладрама «Роля яе жыцця».**
*Клер працуе памочнікам дырэктара часопіса мод. Аднойчы яна знаёміцца з вядомай кіназоркай.*
**0.10 Камедыя «Баль няўклюдаў».**

НТВ БЕЛАРУСЬ

**9.30** «Дзікі свет».
**10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**10.20** «Усё адразу!».
**10.55** «Шчаслівы рэйс».
**11.45** «Іх норавы».
**12.25** «Авіятары».
**13.25** «30-я глава».
**13.55 Дэтэктыў «Кальцо з Амстэрдама».**
**15.40** Асарці.
**16.25** «Адзін дзень. Новая версія».
**17.05 Серыял «Адвакат».**
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.50** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.00** «Галоўны герой».
**22.05** «Нядзельны вечар».
**23.10 Драма «Смак крыві».**



*Карла і Сільвія жанатыя шмат гадоў. Муж і жонка, канешне, прывязаныя адзін да аднаго, але любоўны пыл даўно астыў, і кожны з іх знаходзіць палюбоўнікаў.*

ЦЕНТР

**5.00 «Бармен з «Залатога якара». Маст. фільм.**
**6.35** Права на надзею.
**7.00** Дзённік падарожніка.
**7.25** Сялянская застава.
**8.00** Ключавы момант.
**8.45** «Рэпарцёр».
**9.00** На дачы.
**9.35** Нашы любімыя жывёлы.
**10.10** «Музычная гісторыя». Дзіяна Гурцкая.
**10.45, 23.00** Падзеі.
**10.55 Камедыя «Дуэнья».**
**12.40** Гарык Сукачоў у праграме «Запрашае Барыс Ноткін».
**13.10** «21 кабінет».
**13.45** Падзеі. Маскоўскі тыдзень.
**14.25** «Жывая прырода». «Кіт-забойца».
**15.15** «У пошуках героя». Яўген Урбанскі.
**16.00** «З любоўю да Расіі». Бенефіс Анне Вескі.
**17.35** «Дэтэктыўныя гісторыі». «Не знойдзеце! Забойца».
**18.05 Камедыя «Вясельная вечарынка».**
*Бацька нявесты, сціплы ўрач, знаёміцца з бацькам жаніха — дзіўнаватым сакрэтным агентам.*
**20.00** «У цэнтры падзей».
**21.05 Дэтэктыў «Палец, што ўказвае».**
**23.15 Маст. фільм «Камуніст».**
**1.20 Баявік «Воін».**
**2.50 «Дэтэктыў Джэк Фрост». Серыял.**
**4.30** Мультпарад.

EUROSPORT

**3.00, 5.30, 9.00** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Аўстраліі.
**5.00, 6.30, 10.15, 0.45** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Японіі.
**9.45** Экстрэмальны спорт.
**11.00, 14.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Славеніі.
**12.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі.
**13.30, 19.00** Біятлон. Кубак свету ў Фінляндыі.
**14.45, 22.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні (Вялікабрытанія).
**20.00, 1.45** Агляд снежнага ўік-энда.
**20.30** Байцоўскі клуб.
**23.30** Сумо.
**0.30, 2.15** Навіны Еўраспорту.

***У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!***

## ФІЛЬМ ДНЯ

### «СТБ» 20.45 «ЗАБІЦЬ КАРАЛЯ» (ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ—ГЕРМАНІЯ—ЗША, 2002 Г.)



Англія, 1645 год. Смуты скончыліся, пурытане скінулі караля Карла І. Арыстакрат Ферфакс жадае мяккай рэформы манархіі, а Кромвель, выхадзец з нізоў, патрабуе пакараць смерцю караля.

**Рэжысёр** — Майк Баркер. **У ролях:** Цім Рот, Дагрэй Скот, Алівія Уільямс, Руперт Эверэт.